Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
3 МАЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 83 (29963)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ



ВЯСКОВЫЯ ДЗЕЦІ СТВАРАЮЦЬ «ЧАМАДАН ПАМЯЦІ» МС

ЯКІЯ ПРЫШЧЭПКІ З'ЯВЯЦЦА Ў БЕЛАРУСІ? 6



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег РАМАНАЎ, старшыня Беларускай партыі «Белая Русь»:**

*«Мне здаецца, што інтарэс да партыі высокі. Працуючы ў рэгіёнах, я ўвесь час чую адно і тое ж пытанне: як можна ўступіць у партыю? Гэтае пытанне задаюць і грамадзяне, і кіраўнікі, якія адказваюць за працоўныя калектывы і тым самым выказваюць волю людзей, якія працуюць у тых ці іншых арганізацыях. І я думаю, што пасля таго, як партыя будзе зарэгістравана, мы прыступім да павелічэння нашых шэрагаў з тым, каб кожны, хто жадае быць членам партыі, хто падзяляе яе статут і праграму, мог у яе ўступіць»*

# І сяўба, і касьба





Фота БелТА.

Пакуль калегі па гаспадарцы ў СВК імя Дзеньшчыкова, што ў Гродзенскім раёне, занятыя сяўбой кукурузы, механізатар Алег Бандарэвіч збірае ўраджай. Ён працуе на нарыхтоўцы зялёных кармоў на полі з ужо скошанай азімай свірэпіцай. Сакавітага пачастунку для рагуль з першамайскім укосам плануюць сабраць каля 2 тысяч тон.

## КОРАТКА

- **«Белпошта» датэрмінова выплаціць пенсіі і дапамогі за 9 мая.**
- На сайтах ВНУ з'явілася інфармацыя аб мэтавых месцах і заказчыках кадраў.
- **Натарыусы Беларусі 5 мая пракансультуюць бясплатна.**
- Мінюст зарэгістраваў Беларускую партыю «Белая Русь».
- **Гандлёвую пляцоўку для рэалізацыі прадукцыі лясгасаў адкрылі ў Пінску.**
- Энтамолагі прагназуюць масавы вылет мошак у Брэсце і наваколлях.
- **Мельнікаў — найлепшы гулец, Глебка — аўтар самага прыгожага гола 6-га тура чэмпіянату Беларусі.**
- Мінпрыроды актывізуе работу ў сферы навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый.




## ПРАЦАВАЦЬ І АДПАЧЫВАЦЬ — З РОЗУМАМ

### Як не дапусціць пажару?

**Цёплае надвор'е — заўсёды трывожны перыяд для супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. З наступленнем першых сонечных дзён за суткі ратавальнікам паступае ў сярэднім каля 20 паведамленняў аб узгараннях сухой расліннасці. Адны смажаць шашлыкі, распальваючы вогнішча пры дапамозе гаручых або лёгкаўзгаральных вадкасцяў, што катэгарычна забараняецца. Іншыя наводзяць парадак на прыдамавой тэрыторыі, не выконваючы пры гэтым элементарных правілаў бяспекі.**

СТАР. 4



Фота прэс-службы Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

Адпачынак-2023

## МАРШРУТ НА ЛЮБЫ ГУСТ

### Куды планаваць паездкі?

**Вясенне-летні турыстычны сезон стартаваў у красавіку і працягнецца да сярэдзіны кастрычніка. Якім ён будзе ў Беларусі? Ці чакаецца наплыў гасцей і куды змогуць адправіцца беларусы? Аб трэндах турыстычнай галіны расказалі спецыялісты.**

### КОЛЬКАСЦЬ ТУРЫСТЫЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ РАСЦЕ, АЛЕ ІХ УСЁ РОЎНА НЕ ХАПАЕ

Можна канстатаваць, што сёлета, як і летась, многія беларусы сутыкнуцца з праблемай адсутнасці месцаў пры жаданні выехаць на вялікія выхадныя і не надта нізкімі цэнамі на турыстычныя паслугі, бо попыт на іх расце як унутры краіны, так і ў гасцей з Расіі. Як адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧЫК**, статыстыка па браніраванні санаторна-курортных устаноў і сродкаў размяшчэння нават у параўнанні з мінулым годам паказвае станоўчую дынаміку. Многія з аб'ектаў турызму на летнія месяцы фактычна распрададзеныя.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
23083

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «Абстаноўка нас прымушае рэагаваць на сітуацыю, якая складваецца»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную актуальным пытанням забеспячэння бяспекі і правапарадку і мерам па абароне Дзяржаўнай граніцы. Удзельнікамі нарады стала кіраўніцтва сілавога блоку.**

«Абстаноўка вакол Беларусі складаная. Каля нашых межаў нарошчваецца ваенны патэнцыял НАТА, адбываюцца правакацыі на граніцы. Адкласці гэтую нараду мы не маглі. Абстаноўка нас прымушае рэагаваць на сітуацыю, якая складваецца. Таму было даручана ўраду і сілавому блоку падрыхтаваць сур'ёзныя мерапрыемствы на граніцы з мэтай недапушчэння на тэрыторыю Беларусі рознага роду дыверсантаў. Апошнім часам такія выпадкі пачасціліся. Таму я хацеў бы пачуць вычарпальныя прапановы па супрацьдзеянні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы, адкрываючы нараду.

Па словах старшыні Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі Івана Тэртэля, на падставе звестак, якія паступаюць ад разведкі і іншых падраздзяленняў, прагназуецца значнае абвастрэнне аператыўнай абстаноўкі, якая складваецца вакол нашай краіны.

Сярод асноўных дакладчыкаў таксама выступілі міністр унутраных спраў і старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта. Нарада мела закрыты характар, таму ўсе даклады таксама прайшлі ў закрытым рэжыме.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



Фота БелТА.

❍ **У тэму**

## «СТАНОВІШЧА ПРАГНАЗАВАЛЬНАЕ І КАНТРАЛЯВАЛЬНАЕ»

У размове з журналістамі **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль ЛАПО** падкрэсліў, што граніца — жывы арганізм і сітуацыя на ёй пастаянна мяняецца. «Калі зімой участкі дзесьці непраходныя або цяжкапраходныя, то вясной–летам яны агаляюцца. Натуральна, кіраўнік дзяржавы як Галоўнакамандуючы цікавіцца, якія мы меры прымаем», — растлумачыў ён.

На нарадзе кіраўніку дзяржавы далажылі, як складваецца абстаноўка на граніцы і як у сувязі з гэтым фарміруюцца манеўраныя групы, якой тэхнікай аснашчаюцца падраздзяленні. «Мы ў мінулым адну манеўраную групу сфарміравалі ў мазырскім атрадзе (гэта каля 300 чалавек), цяпер абстаноўка такая, што мы вымушаны фарміраваць адну групу на лідскім напрамку, другую — як рэзерв — на брэсцкім напрамку. Будзе восень — можа, яны там не патрэбны будуць, будзем перакідваць на іншы напрамак», — расказаў старшыня Дзяржпагранкамітэта.

«Становішча на граніцы прагназавальнае і кантралявальнае», — запэўніў Анатоль Лапо.

## «БЯСПЕКА — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ»

**Старшыня КДБ Іван ТЭРТЭЛЬ** падкрэсліў, што Прэзідэнт у гэтай вельмі складанай аператыўнай абстаноўцы трымае руку на ўсіх працэсах, якія адбываюцца. «Усе разумеюць, што сёння бяспека на першым месцы. Мы прагназуем значную эскалацыю абстаноўкі па перыметры нашай краіны. Гэта звязана, па-першае, з баявымі дзеяннямі на паўднёвым напрамку. І па-другое, не спыняюцца спробы дэстабілізаваць сітуацыю ўнутры нашай краіны. Гэта найперш замежныя цэнтры, якія плануюць гэтую дзейнасць пры падтрымцы куратараў, у тым ліку сярод замежных спецслужбаў. Плануецца шэраг сур'ёзных акцый на нашай тэрыторыі. Спонсары не пакідаюць іншага выйсця тым, хто ўжо трапіў у залежнасць, а спонсары — гэта замежныя зацікаўленыя асобы, як фізічныя, так і спецслужбы і іншыя арганізацыі. У гэтых умовах кіраўнік дзяржавы распарадзіўся, каб мы далажылі прапановы па рэагаванні на ўсе гэтыя выклікі», — расказаў ён.

Старшыня КДБ падкрэсліў, што кожны дзень ідзе ціхая работа, каб супрацьстаяць гэтым выклікам і пагрозам. Кіраўнік дзяржавы яе асабіста кантралюе і ведае ўсе нюансы. У найбліжэйшы час будуць паказаны вынікі гэтай работы.

«На жаль, не ўсе грамадзяне ўсведамляюць тую небяспеку, якая складаецца вакол іх, вакол іх сем'яў, таму мы на прыкладзе рэальных матэрыялаў, рэальных затрыманняў, работы контрразведкі, работы падраздзяленняў па абароне канстытуцыйнага ладу, якія прадухіляюць тэракты, пакажам гэтым прыклады, каб нашы людзі разумелі, з чым мы маем справу», — расказаў Іван Тэртэль.

Па ўказанні кіраўніка дзяржавы таксама будзе прыняты шэраг мер, звязаных з узмацненнем жорсткасці контрразведвальнага рэжыму. «Для таго каб працаваць на апярэджанне, на прафілактыку і не дапусціць у канчатковым выніку таго, што адбываецца побач з намі ў розных рэгіёнах», — растлумачыў кіраўнік КДБ.

«Бяспека людзей, нашых грамадзян, сем'яў на першым месцы ў кіраўніка дзяржавы. Мы, адпаведна, дакладваем яму аб выкананні тых даручэнняў, якія дадзены Прэзідэнтам у сувязі з гэтай няпростай сітуацыяй. Але хацеў бы падкрэсліць, што Прэзідэнт руку на пульсе трымае. І нашым грамадзянам, не расслабляючыся, можна быць упэўненымі, што робіцца ўсё, што неабходна», — падкрэсліў Іван Тэртэль.

## ПЕРАМОГА НА МОВЕ ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

**З 29 красавіка да 16 мая ўпершыню праводзіцца Рэспубліканскі тэатральны фестываль «Перамога». Форум праходзіць у межах мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню Дня Перамогі. Яго мэта — спрыяць знаёмству гледачоў з найлепшымі спектаклямі патрыятычнай тэматыкі, заахвочваць творчых работнікаў, якія ажыццяўляюць пастаноўкі такога кірунку.**

Арганізатарамі маштабнага мерапрыемства выступаюць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Мінскі абласны выканаўчы камітэт, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Сцэна апошняга і стала пляцоўкай для правядзення фестывалю.

Аднак трэба адзначыць, што паказы спектакляў, якія сёлета прапаноўваюцца гледачам, будуць праходзіць не толькі ў Купалаўскім. Спектаклі мінскіх тэатраў, з ліку фестывальных, аўдыторыя зможа ўбачыць на іх уласных сцэнах. А ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы пабачым пастаноўкі гасцей сталіцы. На працягу дзён тэатральнага форуму тут для гледачоў запланаваны паказы найлепшых спектакляў, якія прайшлі адбор рэспубліканскай экспертнай камісіі па тэатральным мастацтве. Сярод заяўленых, напрыклад, «Альпійская балада» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, «Трыбунал» Гродзенскага драмтэатра, «Пасланне з мінулага» Палескага драматычнага тэатра і іншыя. Наведванне кожнай пастаноўкі дазволіць аўдыторыі не толькі адкрыць для сябе кранальныя, хоць і часам жудасныя аповеды часоў Вялікай Айчыннай вайны, але і перажыць непаўторныя эмоцыі разам з акцёрскімі калектывамі.

Яшчэ адна важная акалічнасць, што ў праграме вызначаны як час і дата для наведвання пэўнай пастаноўкі, так і наступнае яе абмеркаванне. Па выніках тэатральнага форуму «Перамога» кожны з заяўленых калектываў атрымае дыплом удзельніка.

**Алена ДРАПКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЕС працягваецца рост інфляцыі і падзенне рэальных даходаў



Эканоміка еўразоны амаль не расце, але інфляцыя ў блоку застаецца высокай, што не пакідае Еўрапейскаму цэнтральнаму банку (ЕЦБ) іншага выбару, акрамя як прынесці больш фінансавых пакут хатнім гаспадаркам і прадпрыемствам, каб утаймаваць цэны. Аб гэтым піша Reuters. Людзі ў 20 краінах, у якіх дзейнічае еўра, пакутуюць ад рэзкага росту цэн на паліва і пачынаюць адчуваць наступствы значнага павелічэння кошту запазычанняў ЕЦБ. Аб'ём вытворчасці ў еўразоне павялічыўся ўсяго на 0,1 працэнта за першы квартал, паколькі ўнутранае спажыванне ў многіх краінах стагнавала, з'яўляючыся прыкметай таго, што рост інфляцыі і падзенне рэальных даходаў адбіваюцца на спажыўцах. Нацыянальныя даныя паказалі, што рост цэн застаецца няменна высокім, не пакідаючы ЕЦБ іншага выбару, акрамя як працягваць павышаць працэнтныя стаўкі. Чакаецца, што чарговае адпаведнае рашэнне будзе прынята на пасяджэнні 4 мая. Эканамісты адзначаюць, што павышэнне ставак ЕЦБ і іншымі цэнтральнымі банкамі, верагодна, стрымлівае эканамічны рост і можа нават падштурхнуць еўразону да рэцэсіі. «У другой палове года маштабнае павышэнне працэнтных ставак цэнтральнымі банкамі па ўсім свеце, верагодна, запаволіць рост эканомікі —**«Зв.»**, — адзначыў старшы эканаміст Commerzbank Крыстаф Вайль.

### На акцыях пратэсту ў Францыі затрымана звыш 290 чалавек




Падчас першамайскіх акцыяў пратэсту супраць пенсіённай рэформы і беспарадкаў у Францыі быў арыштаваны 291 чалавек. Як паведаміла «Бі-бі-сі», пра гэта заявіў міністр унутраных спраў Францыі Жэральд Дарманен. Таксама міністр праінфармаваў, што як мінімум 108 паліцэйскіх атрымалі раненні падчас сутыкненняў з пратэстоўцамі па ўсёй Францыі. Ён адзначыў, што такая вялікая колькасць параненых сілавікоў сустракаецца вельмі рэдка. Колькасць параненых пратэстоўцаў не ўдакладняецца. Паводле даных Міністэрства ўнутраных спраў Францыі, у першамайскіх пратэстах прынялі ўдзел каля 782 тысяч чалавек, каля 112 тысяч працýйнікаў пенсіённай рэформы выйшлі на вуліцы французскай сталіцы. Прафсаюз CGT заяўляе, што лічба ўдзельнікаў пратэсту ў тры разы вышэйшая. Большасць з акцый былі мірнымі, але радыкальныя групы кідалі бутэлькі з запальнай сумессю і феерверкі, падпальвалі аўтамабілі. Паліцыя прымяніла супраць пратэстоўцаў слёзатачывы газ і вадамёты.

### У ЗША адбылося масавае ДТЗ з удзелам 72 аўтамабіляў



У амерыканскім штаце Ілінойс у выніку буйной аўтакатастрофы з удзелам 72 аўтамабіляў як мінімум 6 чалавек загінулі і 37 атрымалі раненні. Аб гэтым паведаміў тэлеканал Fox News. Прычынай масавага ДТЗ называюць пыльную буру, якая была ў рэгіёне. Моцны вецер здзімаў пясок з сельскагаспадарчых палеткаў уздоўж шашы, што прывяло да нулявой бачнасці. Дырэктар службы экстраннай дапамогі акругі Мантгомеры Кевін Шот назваў аварыю «вельмі складанай». «Каб праверыць наяўнасць у людзей траўм, нам прыйшлося абшукваць кожны аўтамабіль, незалежна ад таго, удзельнічаў ён у аварыі ці проста спыніўся», — сказаў ён.

Ахова працы

# СКАРАЧАЕЦЦА ВЫТВОРЧЫ ТРАЎМАТЫЗМ

## Спецыялісты расказалі, колькі беларусаў пацярпела на вытворчасці

**За апошнія 20 гадоў вытворчы траўматызм у Беларусі скараціўся ў тры разы, а смяротны — удвая. У многіх краінах сёння кіруюцца канцэпцыяй нулявога траўматызму, з 2019 года яе ўкараняюць і ў нас. Аднак па-ранейшаму ёсць галіны гаспадаркі, якія з'яўляюцца рызыкоўнымі з пункту гледжання траўматызму. Якія прафесіі ўваходзяць у топ-5 самых небяспечных? Праз каго найчасцей адбываюцца няшчасныя выпадкі на вытворчасці? Колькі складае ўрон ад няшчасных выпадкаў на прадпрыемствах? Пра гэта расказалі спецыялісты.**



### ЁСЦЬ НЮАНСЫ

Як адзначыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ**, калі ўпускаюцца пытанні аховы працы, тое нярэдка заканчваецца трагедыяй. Летась пацярпелым ад няшчасных выпадкаў толькі кампанія «Белдзяржстрах» выплаціла 160 мільёнаў рублёў, і гэта не ўвесь урон. У калектыўных дагаворах прадпрыемстваў таксама прадугледжаны дадатковыя выплаты. У выпадку гібелі работніка — 10 сярэдніх гадавых заробкаў або 120 зарплат. Калі работнік застаўся жывы — сярэднямесячны заробак за кожны працэнт страты працаздольнасці.

Летась у краіне захавалася тэндэнцыя скарачэння вытворчага траўматызму. Колькасць пацярпелых падчас работы за год знізілася на 5 % (з 1886 чалавек у 2021 годзе да 1781 у 2022-м). Каэфіцыент частаты вытворчага траўматызму (колькасць траўміраваных на рабоце на 100 тысяч працуючых) летась знізіўся з 49 да 47,4 %. А вось колькасць загінулых на вытворчасці засталася ранейшай — 132 чалавекі. Пры гэтым пацярпелых у стане алкагольнага ап'янення летась упершыню за апошнія гады пабольшала.

— Рост агульнага траўматызму ў нецвярозым стане склаў 28 %. Калі ў 2021 годзе такіх работнікаў было 63, то ў 2022 — 81. Акрамя таго, павялічылася і колькасць загінулых работнікаў у стане алкагольнага ап'янення з 15 чалавек у 2021 годзе да 22 чалавек у 2022-м, — прывёў лічбы намеснік міністра. — Мы бачым праблематыку і будзем узмацняць работу. Сумесна з прафсаюзамі, інспекцыяй па ахове працы будзем праводзіць над маніторынгам тых арганізацый, дзе летась адбыліся выпадкі гібелі работнікаў у стане алкагольнага ап'янення. Абавязкова наведаем іх, паглядзім, як у іх пабудавана работа, асаблівы ўпор зробім на арганізацыю перадзменных медыцынскіх аглядаў і пытанні захавання працоўнай дысцыпліны.

Паводле даных Белстата, летась 18,7 тысячы работнікаў з'явілася на рабоце ў стане алкагольнага ап'янення. Амаль 17 % з загінулых работнікаў было нецвярозымі, праўда, перад прыняццем Дырэктывы № 1 (у 2004-м годзе) іх было 40 %. Негатыўную тэндэнцыю павелічэння загінулых і пацярпелых работнікаў у стане алкагольнага ап'янення спецыялісты тлумачаць адменай адміністрацыйнай адказнасці за з'яўленне на рабоце ў нецвярозым выглядзе.

— Мы разлічвалі, што наймальнікі сваімі мерамі кампенсуюць адмену адміністрацыйнай адказнасці, аднак відавочна, не ўсім тое ўдалося, — адзначыў намеснік міністра.

Самымі небяспечнымі галінамі эканамічнай дзейнасці з пункту гледжання траўматызму Ігар Старавойтаў назваў прамысловасць, будаўніцтва і сельскую гаспадарку — на іх прыпадае больш за 60 % няшчасных выпадкаў. Акрамя таго, неспрыяльная сітуацыя па траўматызме ў лесанарыхтоўчай прамысловасці і энергетыцы. Намеснік міністра падкрэсліў, што ў кожнай з названых галін праводзіцца Год бяспечнай працы. Летась ён прайшоў у лясной гаспадарцы і дрэваапрацоўцы.

— Упор рабіўся на максімальнае выключэнне ручной працы ў лесанарыхтоўках. Бо вопыт сведчыць: чым больш механізаваная нарыхтоўка лесу, тым менш траўмаў. Больш як 60 % такіх работ у нас выконваецца механізаваным спосабам. За год бяспечнай працы ў галіне адбылося змяншэнне агульнага траўматызму на 23 %, са смяротным зыходам — больш чым на 60 %, — расказаў Ігар Старавойтаў.

Сёлета Год бяспечнай працы праходзіць у прамысловасці. Акцэнт робіцца на ўкараненні сістэм кіравання ахоўвай працы. Акрамя таго, штогод практыкуецца правядзенне тыдняў нулявога траўматызму. Ва ўсіх раёнах краіны яны праходзяць двойчы на год. І гэта дае свой плён: летась у сямі раёнах траўматызм аказаўся «на нулі», у 2021-м такіх раёнаў было ўсяго тры.

### ХТО НАЙЧАСЦЕЙ ТРАЎМІРУЕЦЦА?

Як адзначыў **дырэктар Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандр СЁМІЧ**, жанчыны на вытворчасці нашмат больш асцярожныя за мужчын. Сярод загінулых летась 92 % — прадстаўнікі моцнага полу. Таксама летась падчас работы пацярпела сямёра непаўналетніх, двое з іх загінула.

— Перад пачаткам летняга працоўнага семестра сумесна з прафсаюзамі праводзім маніторынг усіх арганізацый, якія прымуць студэнцкія атрады, асабліва калі там будуць людзі, маладзейшыя за 18 гадоў. Наша задача — забяспечыць ім бяспечныя ўмовы працы, — падкрэсліў кіраўнік дэпартамента.

У выніку траўміравання на вытворчасці 89 чалавек летась былі прызнаны інвалідамі, яшчэ 250 страцілі працаздольнасць без устанаўлення групы інваліднасці. Гэтым людзям дзяржава будзе штомесячна рабіць выплаты, кампенсуючы страту здароўя.

Як адзначыў Аляксандр Сёміч, высокі ўзровень траўматызму ў сельскай гаспадарцы, будаўніцтве і прамысловасці звязаны з вялікай колькасцю крыніц павышанай небяспекі — абсталявання і механізмаў, а таксама з высокай доляй ручной працы.

— Калі агульны каэфіцыент траўматызму складае 47,4, то ў сельскай гаспадарцы ён — 149,7: у тры разы вышэйшы. Аналагічная сітуацыя ў прамысловасці і будаўніцтве, — звярнуў увагу кіраўнік дэпартамента.

### ТОП-5 НЕБЯСПЕЧНЫХ ПРАФЕСІЙ

Аляксандр Сёміч падкрэсліў, што важную ролю адыгрываюць самазахавальныя паводзіны самога работніка. Нярэдка той сам ігнаруе правілы бяспекі. Кожны трэці пацярпелы — ва ўзросце 51–60 гадоў, гэта значыць, работнік з вялікім вопытам. Пры гэтым больш за 42 % загінулых мела стаж работы менш за год. Тут як віна наймальніка, так і недахопы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У сувязі з апошнім з работнікамі на працягу першага года іх работы выраншана праводзіць інструктажы па тэхніцы бяспекі праз больш кароткія прамежкі часу — раз на квартал.

У топ-5 самых небяспечных прафесій уваходзяць кіроўца аўтамабіля (прычым найчасцей нешчаслівыя выпадкі здараюцца не падчас руху, а падчас абслугоўвання і рамонту машыны), слесар, жывёлавод, падсобны рабочы, трактарыст. Смяротныя траўміраванні адбываюцца падчас падзенняў з вышыні і ў неабгароджаныя калодзежы і траншэі.

— Пры гэтым 20 чалавек летась траўміраваліся пры перасоўванні па роўнай паверхні — гэта значыць, па ўласнай неасцярожнасці, — звярнуў увагу Аляксандр Сёміч.

### ПА ВІНЕ ЎЛАСНАЙ І НАЙМАЛЬНІКА

Ён прывёў аналіз выпадкаў смяротнага траўміравання работнікаў: у большасці з іх — 30 % тое адбылося па віне самога работніка. У 22 % выпадкаў — па віне наймальніка, у 23 % устаноўлена змешаная (і работніка, і наймальніка) адказнасць. У астатніх выпадках няма віны ні работніка, ні наймальніка. Такое здараецца, калі работніка, які не парушыў правілы дарожнага руху, збівае аўтамабіль або ён гіне ад удару маланкі і іншага.

— У 75 % выпадкаў са смяротным канцом прысутнічае чалавечы фактар, што азначае: такія выпадкі могуць быць ліквідаваны, — падкрэсліў Аляксандр Сёміч.

Змяненне заканадаўства і нарматыўных дакументаў — важная частка ўдасканалення сістэмы аховы працы, паколькі адны віды вытворчасці сыходзяць у нябыт і замяняюцца зусім іншымі. Самыя рэзанансныя змены апошняга часу звязаныя з заменай малака на спецыяльную харчовую прадукцыю па жаданні работніка пры кампенсацыі працы ў шкодных умовах.

Яшчэ адной значнай зменай стала скарачэнне пераліку прафесій і работ, дзе нельга працаваць жанчынам. Са 181 «забароннай» пазіцыі засталося 88. Таксама летась быў пашыраны пералік работ, дзе могуць працаваць непаўналетнія ад 14 да 16 гадоў. Дадаліся такія віды дзейнасці, як рамонт кніг, мыццё аўтамабіляў і сервіроўка сталоў.

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Івана КАРЧЭЎСКАГА**, сёлета плануецца ўнесці змяненні, у прыватнасці, у правілы аховы працы на аб'ектах электрасувязі і ў будаўніцтве.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# КАПРЫЗНЫ СТАРТ МАЯ

## Месцамі дождж з мокрым снегам, а ўначы — замаразкі да мінус 5

**Першыя дні апошняга вясновага месяца, на жаль, не пацешаць жыхароў краіны майскім цяплом. Няўстойлівае з тэмпературнымі ваганнямі надвор'е чакаецца і на гэтым тыдні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ужо ў сераду ў нашу краіну занясе атмасферны фронт, за якім пачне паступаць халодная няўстойлівая паветраная маса. Тэмпература паветра ўначы будзе даволі кантраснай: ад плюс 1 градуса па паўночным захадзе да плюс 12 градусаў па паўднёвым усходзе. Удзень чакаецца плюс 10—16 градусаў.

У ноч на чацвер уплыў атмасфернага фронту яшчэ будзе адбівацца на паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці, і тут пройдуць невялікія дажджы, на астатняй частцы тэрыторыі з ростам атмасфернага ціску істотных ападкаў не прагназуецца. У дзённыя гадзіны ў няўстойлівай прахалоднай паветранай масе, якая паступае з акваторыі Балтыйскага мора, невялікія кароткачасовыя дажджы будуць адзначацца лакальна па тэрыторыі Беларусі. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны будуць замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Месцамі тэмпература паветра складзе плюс 1—6 градусаў. Удзень тэмпература паветра не перавысіць плюс 9—16 градусаў.

У пятніцу на тэрыторыю краіны зрушыцца чарговы франтальны раздзел, след за якім пачне паступаць халоднае паветра з поўначы Еўропы, і ў краіне ўсталюецца халоднае надвор'е. Разам з тым з паніжэннем тэмпературнага фону ў начныя і ранішнія гадзіны пераважна па паўночным усходзе ападкі могуць выпадаць у змешанай фазе ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах будзе слабы туман. Тэмпература паветра ўначы прагназуецца ў межах ад плюс 1 да плюс 6 градусаў. Месцамі, а па поўначы ў многіх раёнах, чакаюцца замаразкі — 0 — мінус 3 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 6—12 градусаў, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — да плюс 14 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, у суботу і нядзелю надвор'е будзе пераважна без ападкаў. Толькі ў асобных раёнах па паўночным усходзе краіны магчымы невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца замаразкі да мінус 5 градусаў, месцамі — плюс 1—3 градусы. Удзень тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 5 градусаў па паўночным усходзе — да плюс 14 градусаў па паўднёвым захадзе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Анонс

# «МІХАСЁВЫ ПРЫГОДЫ»: ПРАЦЯГ ТРАДЫЦЫІ

**У мінулым, 2022-м, годзе на пляцоўцы Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа прайшоў фестываль дзіцячага чытання «Міхасёвы прыгоды». Традыцыя працягнута і сёлета. Другі па ліку фестываль «Міхасёвы прыгоды» адбудзецца 2 чэрвеня 2023 года.**

Поруч з музеем арганізатарамі праекта выступаюць Саюз пісьменнікаў Беларусі, Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска, Выдавецкі дом «Звязда».

У праграме фестывалю — сустрэча з вядомымі і пачынаючымі дзіцячымі пісьменнікамі, аўтограф-сесіі, прэзентацыі кніг, якія толькі што пабачылі свет у розных дзяржаўных выдавецтвах краіны. Да ўвагі наведвальнікаў музея — юных чытачоў і іх бацькоў, настаўнікаў — будзе прадстаўлена тэатральная пастаноўка. Вядомыя кніжныя графікі Беларусі правядуць майстар-класы па маляванні.

— У насычаный праграме свята, — расказвае **дырэктар Коласаўскага музея Ірына МАЦЯС**, — квэсты, розныя інтэлектуальныя гульні, заснаваныя на веданні класічных твораў беларускай дзіцячай літаратуры. Будуць і мерапрыемствы ў знак 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра, аўтара «Палескіх рабінзонаў», блізкага сябра Якуба Коласа. Мы запрашаем да ўдзелу ў фестывалі «Міхасёвы прыгоды» розныя выдавецтвы, дзіцячых пісьменнікаў, мастакоў, якія працуюць з дзіцячай кнігай. І самае галоўнае — запрашаем юных чытачоў. Абяцаем, што будзе цікава!..

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ПРАЦАВАЦЬ І АДПАЧЫВАЦЬ — З РОЗУМАМ

## ПАЛІЛІ СМЕЦЦЕ — НАШКОДЗІЛІ САБЕ

Сёлета першыя ўзгаранні ў экасістэмах былі зафіксаваны ў лютым. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ**, з пачатку года на раніцу 2 мая зарэгістравана 978 прыродных пажараў на плошчы 184,9 га. «З іх — 29 лясных пажараў на плошчы 22,8 га, 949 пажараў травы і хмызняку на плошчы 162,1 га, — удакладніў ён. — Тарфяных пажараў пакуль не зафіксавана. Усяго траўміравана тры чалавекі, загінулі двое грамадзян. Агнём знішчаны нежылы дом, дачнае збудаванне, дзевяць гаспадарчых пабудоў. Пашкоджаны на адной жылой і нежылой хаце, тры гаспадарчыя пабудовы».

Толькі ратавальнікі Міншчыны з пачатку года ліквідавалі 250 узгаранняў сухой расліннасці. У цэнтральным рэгіёне зафіксаваны чатыры лясныя пажары. За гэтымі лічбамі — канкрэтныя наступствы, якіх можна было б пазбегнуць, каб людзі разводзілі вогнішчы, дбаючы як пра навакольнае асяроддзе, так і пра ўласную бяспеку.

Навядзенне парадку на зямлі 8 красавіка скончылася бальніцай адразу для двух жыхароў Мінскай вобласці. Адзін з выпадкаў адбыўся ў Барысаве. Раніцай ратавальнікам паступіла паведамленне аб шпіталізацыі грамадзяніна з апёкамі 10 % цела. Як высветлілі супрацоўнікі МНС, пенсіянер паліў смецце на тэрыторыі ўласнага домаўладання, выкарыстоўваючы пры гэтым лёгкаўзгаральную вадкасць. Па неасцярожнасці мужчына праліў яе на рукі, у выніку чаго адбылася ўспышка пары — і адзенне на ім загарэлася. Грамадзянін атрымаў апёкі жывата, кісці рукі і левай нагі. Пацярпелы самастойна ліквідаваў узгаранне адзення і выклікаў хуткую медыцынскую дапамогу. Падраздзяленні МНС не прыцягваліся.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У той жа дзень, толькі ўжо бліжэй да вечара, з апёкамі 5 % цела быў шпіталізаваны жыхар Дзяржынскага раёна. Ратавальнікі даведаліся, што перад гэтым мужчына распальваў касцёр на тэрыторыі лецішча. Асабістая неасцярожнасць прывяла да ўзгарання сінтэтычнага адзення. Мужчына самастойна ліквідаваў узгаранне і дабраўся да ўстановы аховы здароўя.

Няшчасны выпадак адбыўся ў сярэдзіне красавіка і ў Мінскім раёне. Знаходзячыся на тэрыторыі прыватнага домаўладання, жанчына курыла побач з сужэнцам, які ў гэты час запраўляў бензапілу бензінам. Па неасцярожнасці лёгкаўзгаральная вадкасць трапіла на адзенне жанчыны — у выніку пацярпелая была шпіталізавана з апёкамі 20 % цела.

— Разводзіць вогнішчы на прыдамавых тэрыторыях дазволена, але неабходна выконваць важныя правілы, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Паліць смецце можна толькі ў ціхае, бязветранае надвор'е. Ні ў якім разе для падпалу вогнішча нельга выкарыстоўваць лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці. Спальванне неабходна ажыццяўляць выключна пад беспярэпынным кантролем за працэсамі гарэння і тлення. Нават нягледзячы на вашу прысутнасць каля вогнішча, пад рукой павінны быць першасныя сродкі пажаратушэння: вогнетушыцель, вядро вады або пяску, рыдлёўка — у выпадку пазаштатнай сітуацыі вы зможаце хутка патушыць полымя.

Перад тым, як развесці вогнішча, ратавальнікі рэкамендуюць ачысціць месца, дзе вы будзеце спальваць смецце, ад гаручых рэчываў і матэрыялаў, сухой расліннасці. Прадугледзьце, каб полымя і іскры не трапілі на гаручыя элементы будынкаў, гаспадарчых пабудоў і збудаванняў, дзе захоўваюцца гаручыя рэчывы і матэрыялы. Пасля таго як вогнішча дагарэла, не забудзьцеся заліць вуглі вадой: толькі так можна папярэдзіць паўторнае ўзгаранне.

## ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ СТАЛІ СВЕДКАМІ ЗДАРЭННЯ?

Ратавальнікі рэкамендуюць: калі вы сталі сведкай пажару, неадкладна тэлефануйце па тэлефонах 101 або 112. Менавіта так два тыдні таму зрабіў жыхар Пухавіцкага раёна.

— Патэлефанаваўшы ў службу ратавання, паспяшайцеся пакінуць месца пажару: ідзіце насустрач ветру або перпендыкулярна краю пажару, па прасеках, дарогах, палянах, берагах ручаёў і рэк, — адзначае Анастасія Швайбовіч. — Памятайце, што ў сухое надвор'е і пры ветры падпаленыя сукі, лісце, вуглі пераносяцца на дзясяткі метраў. Пры моцным задымленні, калі ў вас ёсць такая магчымасць, закрыйце рот і нос мокрай анучай. Пры верхавых лясных пажарах, калі гараць кроны дрэў, сховішчам могуць служыць берагі вадаёмаў, буйныя паляны, ліставы лес без хвойнага падросту. Не варта шукаць прытулак на дарогах і прасеках, акружаных хвойным лесам, асабліва маладняком з нізка апушчанымі кронамі, а таксама ў лагчынах, якія параслі лесам.

Калі ж вы сталі сведкай таго, як гарыць трава, то перш-наперш ацаніце становішча. З невялікім ачагом паспрабуйце справіцца самастойна. Збівайце полымя з краю пажару. Выкарыстоўвайце пры гэтым звязку прутоў або галінак лісцявых дрэў. Закідвайце агонь пяском, залівайце яго вадой. Патушыўшы пажар, не сыходзьце да таго часу, пакуль не пераканаецеся, што агонь не разгарэўся зноў. Калі ачаг вялікі, неадкладна патэлефануйце па тэлефоне МНС 101 або 112 і паспрабуйце як мага хутчэй пакінуць месца пажару.

Дарэчы, выпальванне сухой расліннасці забаронена законам. Згодна з артыкулам 16.40 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, за незаконнае выпальванне сухой расліннасці, траў на пні, а таксама ржышча і пожніўных астаткаў на палетках або непрыняцце мер па ліквідацыі выпальванняў вінаватыя асобы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 30 базавых велічынь. У адпаведнасці з артыкулам 16.41, за развядзенне вогнішчаў у забароненых месцах прадугледжана накладанне штрафу да 12 базавых велічынь. Прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры пагражае крымінальнай адказнасцю.

**Вераніка КАНЮТА.**

# МАРШРУТ НА ЛЮБЫ ГУСТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Гэта і не дзіўна, улічваючы, што з кожным годам турыстычная інфраструктура ўдасканальваецца.

— Толькі летась пабудавана 25 новых аб'ектаў турызму: дзве гасцініцы, адзін турыстычны комплекс, 14 аб'ектаў харчавання, пяць аб'ектаў размяшчэння, тры агратурыстычныя комплексы. На 75 аб'ектах праводзіліся маштабныя работы па капітальным рамонце, — прывёў лічбы намеснік міністра. — Сёлета амаль шэсць дзясяткаў аб'ектаў будзе мадэрнізавана. У 15 гасцініцах праведзены капітальныя рамонты, удасканальваюць сваю базу 12 санаторна-курортных устаноў. На выстаўцы-кірмашы «Адпачынак-2023» мы пазнаёміліся з новымі аб'ектамі, у прыватнасці з паркам-атэлем «Яркі» ў Баранавіцкім раёне, турыстычным комплексам «Званае» ў Полацкім раёне, будуецца атэль «Базіліка-Мінск», новая гасцініца «Імпульс» з'явілася ў Оршы.

Летам рэспубліканскі каляндар па традыцыі насычаны рознымі падзеямі: культурнымі, спартыўнымі, забаўляльнымі — усяго каля 200 значных мерапрыемстваў. Сярод іх — такія значныя мерапрыемствы, як «Славянскі базар», «Кліч Палесся», «Viva, Браслаў!». З 4 да 14 жніўня ў Беларусі, прычым не толькі ў сталіцы, але і ва ўсіх абласных цэнтрах і іншых буйных гарадах, пройдуць II Гульні краін СНД. Мерапрыемства абяцае стаць не выключна спартыўным, але падзейным. Для турыстаў будуць працаваць шматлікія зоны гасціннасці, фан-зоны.

— Можна канстатаваць, што ёсць попыт і цікавасць да так званага падзейнага турызму. У цэлым жа сезон будзе цікавы, насычаны, а для суб'ектаў і спецыялістаў турызму — напружаны, — паабяцаў Алег Андрэйчык.

## ЦІ ПАЕДУЦЬ ДА НАС ТУРЫСТЫ?

Летась Беларусь наведала 4 мільёны 800 замежнікаў, больш за 90 % гасцей — прадстаўнікі Расіі. Экспарт турыстычных паслуг склаў 180 мільёнаў долараў. За першы квартал 2023-га, паводле інфармацыі Алега Андрэйчыка, лічбы ўзраслі на 30–40 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Павялічваецца і колькасць турыстаў, якія прыязджаюць па бязвізавым рэжыме з Літвы, Латвіі і Польшчы, — на 6-7 %. Асноўны для расіян кірунак — аздараўленчы турызм. У гэты час у беларускіх санаторыях адначасова адпачывае каля 6 тысяч замежнікаў.

Карыстаюцца папулярнасцю і медыцынскі, і агратурызм. Трэнд апошніх гадоў — індывідуальны турызм — пераважае над групавым. Паколькі граніцы з Расіяй адкрыты, то вельмі часта ў нашу краіну едуць у сямейныя падарожжы ці ў кампаніях сяброў, як правіла, на сваім транспарце. Запатрабаваныя ў гасцей з суседняй краіны і такія актыўныя віды адпачынку, як водны турызм і падарожжы на веласіпедах.

— Мы знаходзімся на рынку ўязнога турызму, які расце. Гэта азначае, што ў сезон попыт часта перавышае прапанову, атэлям і санаторыям даводзіцца працаваць на поўных абаротах і загрузцы. Гэта не вельмі добра, але лепш, чым рынак, які падае, — канстатуе **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ**. — Для нас гэта вялікі шанц на развіццё і прыцягненне інвестыцый.

Ён расказаў, што вялікую ролю ў павелічэнні турыстычных патокаў адыгрывае наяўнасць прамога авіязлучэння. Напрыклад, сёлета з'явіўся прамы авіярэйс паміж Уфой і Мінскам, і на мінулым тыдні ў Беларусь прыехала першая група пенсіянераў з Башкартастана. Каб прывабіць такіх турыстаў, у нашай краіне задумаліся над тым, каб стварыць ім умовы, падобныя да тых, што дзейнічаюць для беларускіх пенсіянераў пры наведванні культурных установаў.

Ёсць крокі насустрач беларускаму турбізнесу і з боку суседзяў. Найперш гэта ліквідаванне шэрагу перашкод у рабоце расійскіх тураператараў з беларускім рынкам. У прыватнасці, пры падтрымцы Мінэканомразвіцця прасоўваецца ініцыятыва, каб турыстычным кампаніям, якія накіроўваюць турыстаў у Беларусь, не патрабавалася такое ж сур'ёзнае міжнароднае забеспячэнне, як пры тым, калі яны адпраўляюць турыстаў у Турцыю і далёкае замежжа.

— Пакуль расійскі рынак мае абмежаванні на іншыя выязныя напрамкі, а ўласная інфраструктура не дазваляе задаволіць унутраны попыт, на рынку Расіі яшчэ некалькі гадоў будзе дэфіцыт на выезд, — лічыць Філіп Гулы. — Наша задача — максімальна гэту плынь сабраць, вытрымаць яе ціск і захаваць нашу якасць. Акрамя таго, для нас гэта магчымасці стварыць дадатковыя працоўныя месцы, забяспечыць глыбіню продажаў, увайсці ва ўзаемадзеянне з авіякампаніямі, прыцягнуць інвестыцыі — уласныя, расійскія і трэціх краін.

Ёсць цікавасць да правядзення ў Беларусі мерапрыемстваў і з боку дзелавых колаў Расіі.

— У нас ёсць дастаткова пляцовак для правядзення буйных мерапрыемстваў. Гэта нашы базы адпачынку, нацыянальныя паркі. Расійскія тураператары, якія прафесійна займаюцца MICE-мерапрыемствамі, часта нават не ведаюць, што і ў абласных цэнтрах ёсць гасцініцы, якія могуць праводзіць канферэнцыі, сімпозіумы, дзелавыя сустрэчы. Маецца і мультымедыйнае абсталяванне для іх правядзення, падрыхтаваны персанал для экскурсій, у тым ліку інтэрактыўных, — расказаў **дырэктар «Прэзідэнт-Атэля» Аляксей ПАДАМАЦЬКА**.

## КУДЫ ПАЕХАЦЬ БЕЛАРУСАМ?

— Летась мы пабілі рэкорд 2019 года, калі ў рамках арганізаванага турызму падарожнічала 1,5 мільёна беларусаў. Гэта на 200 тысяч больш, чым у 2019-м. Калі ўлічваць і неарганізаваны турызм, то гэту лічбу можна памнажаць на 4. Сёлета з'явілася 211 новых турыстычных маршрутаў, — паведаміў Алег Андрэйчык.

Такім чынам, акрамя заўсёды папулярных Брэсцкай крэпасці, Белавежскай пушчы, Мірскага і Нясвіжскага замкаў, цяпер сёння кожны можа знайсці маршрут на свой густ. А асвоіць яго дапамогуць вопытныя экскурсаводы.

— Летась падрыхтаваны 191 экскурсавод. На сёння маецца 1050 экскурсаводаў па розных напрамках і каля 150 гідаў-перакладчыкаў, якія працуюць на замежных мовах. У 70 раёнах краіны ёсць, прынамсі, адзін падрыхтаваны і атэставаны экскурсавод. Ставім задачу, каб такі спецыяліст быў у кожным раёне краіны, — падкрэсліў Алег Андрэйчык.

**Алена КРАВЕЦ.**

Перажытае-незабытае

# «Толькі б не было вайны! Толькі б не было вайны...»

**Пачуўшы тую фразу ад старых ці проста нашмат старэйшых, людзі маладыя часта крывіліся, а то і ўголас абураліся: не маглі зразумець, адкуль вось гэтая абмежаванасць, як можна так мала (?!) хацець? Не без таго — яны асуджалі...**

**Зрэшты, мінулы час тут зусім недарэчы, бо многія і сёння могуць абурацца, сапраўды не разумець. Я паспрабую растлумачыць — на прыкладзе сваёй сям'і.**

## ...Іх гналі на расстрэл

Да вайны, па словах маёй старэйшай сястры Жэні, нашы Маляцічы, што на Крычаўшчыне, былі мястэчкам, дзе жыло каля пяцісот чалавек, у асноўным яўрэі і беларусы. Яны разам працавалі ў калгасе і досыць добра зараблялі: перад вайной, як расказвала сястра, на працадні выдавалі столькі дабра (гэта значыць збожжа), што людзі не ведалі, куды яго ссыпаць.

Сям'я па тых часах была ў нас самая звычайная: тата, мама, чацвёра дзяцей. Я, апошняя і пятая, тады яшчэ не нарадзілася, а Жэня, самая першая, ужо выйшла замуж. Вось толькі пажыць у новым статусе ёй амаль не ўдалося: у самым пачатку вайны яе муж пайшоў на фронт.

Калі немцы апынуліся непадалёк ад Маляціч, людзі кінуліся ўцякаць. Наша сям'я ў якасці бежанцаў трапіла ў вёску Слабуты. Потым, калі фронт адкаціўся далей, вярнулася дамоў і — што было рабіць — жыла пад немцамі.

Тыя забіралі ў людзей скаціну, прадукты і ўсё, што ім падабалася. Баючыся дыверсій на чыгунцы і аэрадроме, прымушалі абапал выразаць усе дрэвы і кусты, вывозілі ў Германію драўніну і нават чарназём, хапалі і зганялі ў Нямеччыну моладзь. Мястэчка жыло ў пастаянным страху.

А далей — горай: праз нейкі час пачалі вынішчаць яўрэяў. На смерць іх гналі па вуліцы, расстрэльвалі за аколіцай. Мама расказвала, што бачыць тое, чуць стральбу, крыкі людзей і не кінуцца ім на дапамогу было проста немагчыма!

Яна хацела ўратаваць хоць бы суседскую двухгадовую дзяўчынку. Але прыйшлі паліцаі, схапілі іх абедзвюх і маю сястрычку Тоню — пагналі на расстрэл.

Нам пашчасціла: за бургамістра ў мястэчку быў чалавек, якога савецкая ўлада пакінула для падпольнай работы. Маму і Тоню яму ўдалося выратаваць...



Я, мама, Жэня і Тоня з другім сынком. 1956 г.

Восенню 1943-га, калі пачаліся баі за вызваленне Крычаўскага раёна, мясцічкоўцам зноў прыйшлося ўцякаць. На зіму 1943—1944 гадоў нашу сям'ю з сямі (!) чалавек (у Жэні ў 1942-м нарадзіўся сын Міша) прытулілі (а калі па праўдзе, дык проста выратавалі ад холаду і голаду — тобок ад смерці) добрыя людзі з вёскі Лапаціна Мсціслаўскага раёна. Па цяперашнім часе не тое што цяжка — нават немагчыма ўявіць, што ў звычайнай сялянскай хаце маглі зімаваць тры зусім чужыя сям'і: сямнаццаць (!) чалавек. І нешта ж ім трэба было есці, на нечым спаць, неяк мірыцца, дзяліцца апошнім...

Тады і там памёр наш тата (на фронт яго не прызвалі з-за язвы страўніка, але ж з ёю ў мірны час ён, напэўна, жыў бы да старасці).

Праз два тыдні пасля таго нарадзілася я, а мама — цяжка захварэла: перанесла малярыю, падарвала сэрца.

## У нашых суседзяў была рыдлёўка

...Як толькі сышоў снег, наша сям'я з бежанцаў вярнулася ў сваё мястэчка, дакладней — на папялішча, якое засталося на месцы Маляціч. Там наша Жэня атрымала пахаванку на мужа. Ён, як паведамлялася, загінуў смерцю храбрых, а яна ў 21 год засталася не проста ўдавой з маленькім дзіцем, а галавой сям'і бяздомнікаў з цяжкахворай мамай і намі, ледзь жывымі малодшымі братамі і сёстрамі. Тоні тады было 14, Лёню — 11, Колю — 6, мне — лічаныя месяцы.

Старэйшым нейкім чынам удалося выкапаць зямлянку, у якой сям'я жыла не толькі ў голадзе, але і ў холадзе. Ва ўсякім выпадку маёй калыскай і ложкам два доўгія гады служыў зрэбны мех, падвешаны да столі. Мае сёстры і браты хадзілі напаўраздзетыя, у парваных портках і кашулях. Іх проста не было чым залатаць... Не дзіва, што Коля захварэў на менінгіт, ледзьве не памёр — на ўсё астатняе жыццё нажыў праблемы са слыхам.

А працаваць жа ўсё роўна трэба было. І свой агарод пасадзіць таксама! У нашых суседзяў была рыдлёўка, у нас — вілы. У першую пасляваенную вясну бульбу садзілі не клубнямі і не іх палавінкамі-чацвярцінкамі, а лупінамі з вочкамі.

Тая бабуля, у якой мы жылі ў бежанцах, перадала нам трохі ячменю, трохі насення фасолі, бобу, гарбузоў, морквы, рэпы і бручкі. Шчасце, што зямля была ўрадлівая і догляд добры...

Выжывалі за кошт ураджаю.

А трэба ж яшчэ і будавацца.

Жэня сама працавала, як вол, і свaім малодшым спуску не давала. Тоня ў 1945-м завербавалася ў Навалокі Іванаўскай вобласці, працавала там ткачыхай. Навучылася шыць, вязаць, вышываць, гафтаваць...

У 1950-м яна выйшла замуж. Яе Шура быў прыгожы добры чалавек і выдатны токар! «За яго б і настаўніца з падскокам пайшла!» — сказала свякроў, без радасці прымаючы нявестку без адукацыі, без бацькі і без пасагу...

Пасялілася маладая сям'я ў Крычаве, на прыватнай кватэры. Без дапамогі бацькоў, свaімі рукамі, з мазаля, як той казаў, узялася «ляпіць» будан. Да слупкоў з двух бакоў прыбівалі дошчачкі, паміж імі ўтрамбоўвалі пілавінне. Так раслі сцены. Дах крылі рубероідам. Шура сам зрабіў пліту, на якой можна было спаць. Амаль такім жа спосабам (толькі ўжо з апалубкай і шлакабетонам) побач будавалася хата.

Тоніна сям'я пераехала ў яе толькі на дзясяты год і ўжо з трaімі дзецьмі. Гадуючы іх, трымаючы гаспадарку, дапамагаючы мужу ў будаўніцтве і падзарабляючы шыццём ды вязаннем, Тоня працавала на аўтавакзале — касірам, дыспетчарам. На рабоце яе вельмі цанілі і не раз абіралі дэпутатам.

Усё жыццё мая сястра шкадавала, што не змагла атрымамаць адукацыю.

## Слёзы трактарыста

...Пасля вайны мужчын у нашых Маляцічах амаль не было (у 1941-м прызвалі ўсіх дзеяздольных, у 1943-м, пасля вызвалення раёна ад немцаў — тых, хто да іх дарос...). А таму хоць-нехаць сталелі дзеці. Мой брат Лёня з 15 гадоў пайшоў у трактарысты. Праўда, спачатку і самі трактары, і якую-ніякую тэхніку, што ўдалося схаваць перад прыходам немцаў, трэба было давесці да ладу, часам — сабраць па вінціках.

Гэта як зараз перад вачыма: раскладзе брат запчасткі на траве, нешта збярэ з іх, паставіць на трактар, а той не заводзіцца: ні так, ні гэтак — ніяк! Лёня з тае крыўды забяжыць у хату, схаваецца ў запечак і плача-плача... А потым зноў на вуліцу і за работу: нешта круціць, даводзіць... І глядзіш — атрымалася!

Коля, хоць і малы быў, круціўся побач з братам, прыглядаўся, нешта дапамагаў. Ён таксама хацеў стаць трактарыстам, але ж з-за праблем са слыхам нават школьная вучоба яму давалася цяжка.

З шостага класа Коля пайшоў працаваць: на кані падвозіць кармы на ферму, якія трэба было самому нагрузіць, а потым разгрузіць.

Летам, калі каровы выходзілі на пашу, брату знаходзілі іншую работу: ён хадзіў араць, баранаваць, у час сенакосу дзень пры дні сядзеў то на коннай касілцы, то на грабілцы. Як ні цяжка было, ён ішоў усюды і ніколі не скардзіўся.

Старшыня калгаса — добры чалавек! — вельмі цаніў хлапчука за стараннасць. Помню, сам купіў яму набор інструментаў і лобзік. Доўгімі зімовымі вечарамі Коля стаў майстраваць сані, лыжы, вупраж для калгасных коней. Вельмі любіў выпільваць лобзікам.

...У 1956 годзе памерла наша гаротніца-мама, і Коля паехаў на цаліну. Там яму ўдалося паступіць на курсы механізатараў (тут дырэктар школы, ведаючы, з якой прычыны Коля не змог вучыцца ў шостым класе, без нічога-ніякага падпісаў яму даведку аб заканчэнні сямігодкі). Такім чынам брат змог атрымаць спецыяльнасць, жаніцца, пабудаваць дом, вырасціць траіх дзяцей. Усе яны (а потым ужо іх дзеці) атрымалі вышэйшую адукацыю, а Коля — узнагароды за працу.

## Лёня быў самы лепшы!

...У Маляцічах нас засталося трое: сястра Жэня, яе сын Міша і я — сям'я, прычым з вялікай гаспадаркай. Мы трымалі карову, свіней, авечак, гусей, курэй... Усё гэта было ў асноўным на мне. Жэня па-ранейшаму згаджалася на самыя цяжкія работы ў калгасе і працавала там (крыху падросшы, і Міша) ад цямна да цямна.

Жыццё прывучыла маю найстарэйшую сястру да ашчаднасці і строгасці, нават да суровасці, хоць ад прыроды (да мяне гэта потым дайшло) Жэня была вялікай жартаўніцай, танцоркай і пяюхай, помніла безліч прыпевак і песень, а як умела расказваць...

Да яе, удавы фактычна з двума дзецьмі (сынам і мной, малодшай сястрой), заляцаліся мужчыны (і нават вельмі ніядрэнныя), клікалі замуж. Яна ўсім адмаўляла, казала, што яе муж, яе Лёня, быў самы лепшы!

...Мы з Мішам скончылі дзесяцігодку і прафтэхвучылішчы, пайшлі працаваць і завочна вучыцца далей.

Міша стаў інжынерам, я, яго цётка, на паўтара года за яго маладзейшая, — настаўніцай.

У нашых дзяцей ужо было маленства — і можна сказаць, шчаслівае, ім не давялося столькі працаваць і вучыцца завочна.

...Я не бачыла вайны, але змалку чула ад іншых: «Калі б не вайна...», «Калі б не вайна...»

У кожнай сям'і нехта загінуў, памёр, застаўся інвалідам. А колькі гаротных удоў, колькі сірот, колькі зламаных лёсаў, няспраўджаных мар, ненароджаных дзяцей...

Нам сорамна, нам проста нельга не помніць пра гэта, нельга дапусціць новай, яшчэ больш смяротнай вайны.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

---

Усмешачку

# Глядзім і бачым

## Кожны сваё

**У выхадныя мы з мужам і сынам (яму ў ліпені шэсць) любім некуды схадзіць: у кіно, у музей, на выстаўку... Альбо проста пагуляць па горадзе, прычым кожны раз загадзя распрацоўваем маршрут: стараемся прайсці па нейкіх незнаёмых вуліцах, новых сцежках у парку.**

У той раз — у знакамітым Лошыцкім — нам сустрэліся двое: маладая брунетка ў міні спаднічцы і доўгім чорным плашчы з чырвоным шалікам і побач з ёй — гэткі ж чорны дог з чырвоным аброжкам (нашыйнікам).

— Прыкольная парачка! — сказала я сваім мужчынам.

— Дзе? — спыталі тыя.

— Ды мы размінуліся. Вунь, — паказваю, — брунетка з догам.

— Я толькі сабаку бачыў, — прызнаўся сын.

— А я — дзяўчыну, — зляцела з языка ў мужа.

Карацей, у час прагулак шмат што можна ўбачыць, а потым — яшчэ і пачуць!

**А. Няхай,**
*г. Мінск.*

---

Весткі з месцаў

# «Кажушок», здавалася, сышоў...

**Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены традыцыйнай на Маларытчыне тэхналогіі ткацтва кажушком.**

Ва ўсіх нюансах і тонкасцях, як патлумачыла загадчыца раённага цэнтра народнай творчасці Валянціна Струнец, людзям далёкім ад кроснаў разабрацца цяжка. Факт, што ў другой палове мінулага стагоддзя, гэтая тэхналогія лічылася страчанай. Узнавіць яе змагла народны майстар Рэспублікі Беларусь Сцепаніда Сцепанюк з Дарапеевіч, і цяпер у нашым раёне ўжо восем майстрых, якія пераняллі традыцыю і ўжо самі з'яўляюцца яе прадаўжальнікамі. Гэта Валянціна Струнец і Валянціна Гатоўчыц *(на здымку)*, Святлана Луцык, Людміла Сакалюк, Настасся Струнец, Ульяна Верашчагіна, Вольга Смаль і Алена Рыбакова.



Для пашырэння тэхналогіі праведзены дзясяткі майстар-класаў, сумеснымі намаганнямі створаны гурткі ткацтва пры сельскіх дамах культуры, доме фальклору, у школе народнай творчасці.

Па адроджанай тэхналогіі — кажушком — створаны касцюмы для аматарскіх калектываў «Вясковая табала» Хаціслаўскага СДК і «Радасць» Брэсцкага ГДК, строі для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

**Мікалай Навумчык, фота аўтара.**
*г. Маларыта.*

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

# ІМУННЫ КУПАЛ

## Якія новыя прышчэпкі могуць стаць даступнымі ў Беларусі?

**Як пандэмія COVID-19 паўплывала на ўзровень вакцынацыі насельніцтва ў Беларусі і ў свеце? Ці ўказвае яе агульнае зніжэнне на магчымасць вяртання такіх небяспечных хвароб, як адзёр, краснуха, паратыт? Ад якіх хвароб абавязкова мусяць прышчапляцца дарослыя? Якія новыя прышчэпкі спецыялісты прапануюць унесці ў нацыянальны каляндар вакцынацыі? Пра гэта і іншае падчас Еўрапейскага тыдня імунізацыі расказалі спецыялісты.**



### 97-98 % беларусаў прышчэплена ад асноўных інфекцый

Паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у 2021 годзе 25 мільёнаў дзяцей у свеце прапусцілі прынамсі адну асноўную вакцынацыю, а 18 мільёнаў непаўналетніх увогуле не былі вакцынаваны. У Еўрапейскім рэгіёне таксама многія дзеці не атрымлівалі прышчэпкі ў адпаведнасці з нацыянальнымі календарамі. З пачатку пандэміі COVID-19 каля 1,2 мільёна прапусціла вакцынацыю супраць адру, паратыту, краснухі. У прыватнасці, адзёр асабліва небяспечны для дзяцей малодшага ўзросту і ў Еўропе колькасць яго выпадкаў расце.

Пры гэтым ёсць і поспехі барацьбы з асабліва небяспечнымі хваробамі. Як расказаў **прадстаўнік СААЗ у Рэспубліцы Беларусь, кіраўнік краінавага офіса СААЗ у Беларусі Сяргей ДЫЁРДЗІЦА**, з 2002 года ў Еўропе няма поліяміеліту, колькасць выпадкаў краснухі скарацілася з 622 тысяч у 2000-м да 77 выпадкаў у 2021-м. Колькасць выпадкаў слупняку знізілася з 412 да 43, коклюшу — з 53,6 тысячы да дзвюх тысяч, эпідэмічнага паратыту — з 243 тысяч да 3,4 тысячы.

— Беларусі таксама ёсць чым ганарыцца. Пераважная частка груп насельніцтва — 97-98 % — ахоплена вакцынацыяй ад асноўных інфекцый, якія можна папярэдзіць, — адзначыў Сяргей Дыёрдзіца. — Нядаўна міністру аховы здароўя быў уручаны сертыфікат СААЗ аб дасягненні рэгіянальных мэтавых паказчыкаў у барацьбе з гепатытам В шляхам імунізацыі. Яшчэ ў 2010 годзе гепатыт В аказаўся ў дзясятцы хвароб — лідараў па колькасці смяротных выпадкаў. Нягледзячы на наяўнасць эфектыўнай і бяспечнай вакцыны, у 2019 годзе ў свеце памерла 820 чалавек — галоўным чынам ад цырозу печані і гепатацэлюлярных карцыном. На гэтым фоне работа беларускай сістэмы аховы здароўя выглядае добра. З 2002 года доля вострых формаў гепатыту скарацілася ў восем разоў. А 95 % выпадкаў, якія выяўляюцца, складаюць хранічныя і латэнтныя формы, што падтрымліваюць цыркуляцыю ў папуляцыі, у той час як з'яўленне новых выпадкаў, асабліва сярод тых, хто атрымаў вакцыну ў дзіцячым узросце, практычна спынена.

Пры гэтым прадстаўнік СААЗ падкрэсліў, што ёсць кірункі вакцынацыі, над якімі давядзецца працаваць. У прыватнасці, над укараненнем у нацыянальны каляндар вакцынацыі ад віруса папіломы чалавека.

— Вакцынацыя дзяўчат значна зніжае рызыку развіцця раку шыйкі маткі ў больш познім узросце. У Вялікабрытаніі, якая адна з першых укараніла такую прышчэпку, амаль ліквідаваны рак шыйкі маткі ў жанчын, што нарадзіліся пасля верасня 1995 года. Сёння ў 45 краінах еўрапейскага рэгіёна вакцынацыя супраць віруса папіломы чалавека даступная для ўсіх дзяўчынак ва ўзросце 9-14 гадоў, а ў 20 краінах такую вакцынацыю прапануюць і для хлопчыкаў.

### Прыхільнасць да вакцынацыі вырасла

Як адзначыла **загадчыца цэнтра вакцынапрафілактыкі Гарадской дзіцячай інфекцыйнай клінічнай бальніцы Аксана ТАРАНАВА**, у Беларусі створаны ўсе ўмовы для забеспячэння бяспечнай і эфектыўнай вакцынацыі і бесперабойнага забеспячэння імуналагічнымі прэпаратамі ў рамках нацыянальнага календара. Вакцынацыя праводзіцца супраць 12 інфекцыйных хвароб: туберкулёзу, віруснага гепатыту В, дыфтэрыі, слупняку, коклюшнай інфекцыі, адру, эпідэмічнага паратыту, краснухі, грыпу, групам рызыкі — супраць гемафільнай і пнеўмакокавай інфекцыі. Робяцца прышчэпкі і па эпідэмічных паказаннях: прафесійным групам рызыкі, насельніцтву, якое пражывае на тэрыторыях з высокай рызыкай развіцця прыродна-асяродкавых інфекцый, кантактам у эпідэмічных ачагах, асобам, якія выязджаюць на тэрыторыі, неспрыяльныя па жоўтай ліхаманцы. Па жаданні можна прышчапіцца ад пнеўмакокавай і менінгакокавай інфекцый, ветраной воспы, віруснага кляшчовага энцэфаліту.

— Прыхільнасць да правядзення прафілактычных прышчэпак вырасла, калі зыходзіць з агульнай колькасці асоб, якія звяртаюцца ў гарадскі цэнтр вакцынапрафілактыкі, — падзялілася меркаваннем спецыяліст. — Часта да нас сталі звяртацца пацыенты, у якіх, акрамя алергіі, маюцца хваробы нервовай сістэмы, людзі з цяжкімі імунадэфіцытнымі станамі, са злаякаснымі новаўтварэннямі, з лейкозамі, дзеці і дарослыя, якім зроблена перасадка касцявога мозгу, печані, нырак, дзеці з кардыяпаталогіяй. У постпрышчэпачным перыядзе розніцы паміж гэтымі групамі асоб і здаровымі людзьмі мы не выяўляем. Ніякіх сур'ёзных пабочных рэакцый не назіраецца. Хранічная паталогія не з'яўляецца супрацьпаказаннем ад прышчэпак.

### Што прапануюць унесці ў нацыянальны каляндар?

Падрыхтавана абгрунтаванне ўкаранення ў нацыянальны каляндар вакцынацыі супраць пнеўмакока, расказала **загадчыца кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый БелМАПА, доктар медыцынскіх навук, прафесар Ганна КЛЮЧАРАВА.** Акрамя таго, на парадку дня абгрунтаванне і вывучэнне магчымасцяў уключэння прышчэпкі ад віруса папіломы чалавека. А гэтае захворванне, між іншым, стаіць на чацвёртым месцы ў структуры смяротнасці ад анкалагічных хвароб сярод жанчын ва ўсім свеце.

— Магу згадаць вялікую колькасць захворванняў, якіх магло б не быць. Напрыклад, слупняк некалькі гадоў таму ў непрышчэпленай дзяўчынкі, «дзякуючы» адносінам да вакцынацыі бацькоў. Дзіця на фоне сутаргаў атрымала вывіх пазванка, і тое, што яна засталася жывая і без неўралагічных наступстваў, — цуд, які зрабілі ў бальніцы ўрачы. Дыфтэрыя, якая «перазджала» з Расіі ў тыя гады, калі быў пад'ём захваральнасці. На гэтым фоне ў дзяўчынкі развіўся востры міякардыт, яе не ўдалося выратаваць, хоць усю ноч працавалі кардыяхірургі. Можна згадаць выпадак адру, калі маці сказала, што калі б яна ведала, як цяжка на яго хварэюць, то не толькі б сваіх дзяцей прышчапіла, а і ўсіх бы агітавала за прышчэпкі. Вакцынацыю не заменіць нішто, гэта адно з галоўных дасягненняў медыцынскай навукі, — рэзюмавала Ганна Ключарава.

### Больш за 70 % беларусаў прышчэплена ад COVID-19

У 2022 годзе, як і ў папярэднія гады, узровень прафілактычных прышчэпак па ўсіх пазіцыях нацыянальнага календара быў не ніжэйшы за 97 %. Як адзначыў **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, прадстаўнік ЮНІСЕФ Кірыл ІГНАТАЎ**, нават у пандэмійныя гады ў Беларусі не дапушчана зніжэння ўзроўню планавай імунізацыі.

— Шматгадовая імунізацыя па нацыянальным календары дазволіла атрымаць і падтрымаць статус краіны, свабоднай ад поліяміеліту, элімінацыі адру і краснухі і распачаць рэалізацыю мэт кантролю віруснага гепатыту В. У 2022 годзе зафіксаваны адзінкавыя выпадкі захворвання на коклюш і эпідэмічны паратыт, не рэгістраваліся выпадкі дыфтэрыі, адру, краснухі і сіндрому прыроджанай краснухі, — пералічвае Кірыл Ігнатаў.

Акрамя таго, у Беларусі па выніках мінулага года дасягнуты планаваны паказчык у 72,6 % па вакцынацыі супраць COVID-19. У тым ліку прышчэплена 17,6 % дзяцей і падлеткаў ад 5 да 17 гадоў. Бустарнай вакцынацыяй ахоплена не менш за 91,6 % ад тых, хто завяршыў асноўны курс вакцынацыі. Па стане на канец красавіка бягучага года ў краіне прайшло поўны курс вакцынацыі больш за 6 мільёнаў 622 тысячы чалавек. Першы бустар завяршыла больш за 5 мільёнаў 815 тысяч, другі бустар — больш за 3 мільёны 168 тысяч.

Супраць грыпу прышчапілася 40,6 % насельніцтва, а гэта больш за 3,6 мільёна чалавек, у тым ліку 76 % пацыентаў у групах рызыкі.

### Ці трэба правяраць антыцелы перад прышчэпкай?

Усе дарослыя мусяць праходзіць вакцынацыю ад дыфтэрыі і слупняку кожныя дзесяць гадоў. Дату вакцынацыі прапускаць не варта. Прышчэпка дазваляе падтрымаць узровень імунітэту на належным узроўні. Разам з тым у вызначэнні цітру антыцелаў перад гэтымі і іншымі прышчэпкамі няма мэтазгоднасці, адзначае Ганна Ключарава.

— Як мы ведаем, пры большасці інфекцый працуе не толькі гумаральны, але і клетачны імунітэт, які не вымяраецца. І ёсць даследаванні, на аснове якіх зроблены высновы, з якой кратнасцю мусіць праходзіць вакцынацыя, якая схема і дозы павінны быць. Ад дыфтэрыі і слупняку кожнага дарослага чалавека вакцынуюць кожныя дзесяць гадоў, не вымяраючы антыцелы, бо вядома, што да гэтага часу імунітэт падае.

Ёсць групы рызыкі, дзе вымяраецца ўзровень антыцелаў. Напрыклад, цяжарныя жанчыны, інфіцыраваныя вірусам гепатыту В. У выпадку з імі прымяняецца схема лячэння, каб немагчыма было інфіцыраваць дзіця. Пры гэтым усё роўна вызначаецца ўзровень імунітэту і антыцелаў.

---

Пытанне-адказ

# ЦІ МОЖНА ЎЖЫВАЦЬ КЛЯНОВЫ СОК?

***У нашым рэгіёне традыцыйным дрэўным напоем з'яўляецца бярозавы сок, аднак ёсць здагадка, што кляновы сок па сваёй карысці не саступае бярозаваму і добра засвойваецца. Ці можна ўжываць кляновы сок і ці ёсць у ім карысць?***

**Пётр Нікіцін, пас. Акцябрскі.**

Адказвае **ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена СМІРНОВА:**

— Збор кляновага соку не адрозніваецца ад збору бярозавага. Набраканне пупышак служыць сігналам да пачатку збору, а іх распусканне сведчыць аб заканчэнні. Для збору выбіраюць клён удалечыні ад забруджаных месцаў (аўтамагістраляў і прамысловых прадпрыемстваў) з дыяметрам ствала не менш як 20 см і пышнай кронай.



У склад кляновага соку ўваходзяць вада, цукроза, алігацукрыды, мінералы, арганічныя і тлустыя кіслоты, глюкоза, караціноіды, дэкстроза, вітаміны Е, РР, Ү, С. Таму кляновы сок карысны пры авітамінозе, ён умацоўвае імунітэт, чысціць крывяносныя сасуды ад таксінаў, зніжае крывяны ціск, спрыяе памяншэнню вязкасці крыві і з'яўляецца прафілактычным сродкам супраць утварэння тромбаў у сасудах, аказвае мачагоннае і жаўцягоннае дзеянне, спрыяе запаволенню працэсаў старэння, паляпшэнню рэгенерацыі тканак, зніжэнню ўзроўню халестэрыну ў крывяной сістэме, нармалізацыі функцыянавання страўнікава-кішачнага тракта, паскарэнню абмену рэчываў, запаволенню развіцця анкалагічных працэсаў і запаленняў, умацаванню касцяной і нервовай тканак.

Нягледзячы на вялікую колькасць станоўчых уласцівасцяў, кляновы сок мае свае супрацьпаказанні. У сувязі з утрыманнем цукру не рэкамендуецца ўжываць яго людзям з цукровым дыябетам. Ён таксама можа выклікаць моцную алергічную рэакцыю. Кляновы сок супрацьпаказаны дзецям да трох гадоў. Старэйшыя дзеці могуць ужываць напой у аб'ёме не больш за 100 мл у дзень.

Кляновы сок мае мачагоннае дзеянне, таму людзям з праблемамі мочавыдзяляльнай сістэмы ён рэкамендуецца ў невялікіх колькасцях.

Памятайце, што тэрмін захоўвання свежага кляновага соку не павінен перавышаць трох дзён, у замарожаным выглядзе ён можа захоўвацца да года.

Самае распаўсюджанае выкарыстанне кляновага соку — перапрацоўка яго ў кляновы сіроп. Для вырабу сіропу ваду выпарваюць з дрэўнай вадкасці, пры гэтым салодкі прадукт гусцее і ператвараецца ў цягучую масу з характэрнымі смакавымі якасцямі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
3 мая 2023 г. № 15 (701)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПАЧУЦЬ КОЖНАГА І ДАПАМАГЧЫ

## З якімі пытаннямі падчас асабістага прыёму грамадзяне звярталіся да Наталлі КАЧАНАВАЙ









Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**У народзе кажуць: колькі людзей — столькі і меркаванняў. А яшчэ, як паказвае жыццё, колькі людзей — столькі і праблем. І, на жаль, не ўсе з іх грамадзяне могуць вырашыць самастойна. Ад безвыходнасці шукаюць выйсце і стукаюць у любыя дзверы, дзе іх могуць выслухаць і дапамагчы. Такімі дзвярамі ўжо на працягу многіх гадоў з'яўляецца Савет Рэспублікі.**

Да сенатараў, якія рэгулярна праводзяць асабістыя прыёмы грамадзян, са сваімі пытаннямі едуць жыхары з усёй краіны. Жадаючых трапіць на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі заўсёды шмат — людзі ведаюць, што пасля размовы з Наталляй Іванаўнай яны ніколі не сыдуць без адказу і канкрэтнай парады. Вельмі часта пытанні вырашаюцца адразу на месцы.

Праблемы, з якімі прыходзяць і едуць у Савет Рэспублікі або ў іншае месца, дзе сустракаюцца з людзьмі сенатары, — самага рознага характару. Падчас апошняга асабістага прыёму грамадзян, які спікер верхняй палаты парламента праводзіла 27 красавіка, насельніцтва хвалявалі пытанні будаўніцтва і паляпшэння жыллёвых умоў, землекарыстання і падаткаабкладання. Традыцыйна не абышлося без праблем, звязаных з жыллёва-камунальнай гаспадаркай, працоўнымі ўзаемаадносінамі. З просьбамі звярталіся і бацькі хворых дзяцей, і дзеці пажылых бацькоў, якім патрэбна дапамога, і грамадзяне іншых краін, якія прасілі паскорыць працэс атрымання беларускага грамадзянства.

### Дзецям-інвалідам — асаблівая ўвага

Сяргей Рыбалтоўскі прыйшоў на прыём з сынам-інвалідам. Мужчына паскардзіўся на зацягванне рамонтных работ у Цэнтры сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і інвалідаў «Расток», які знаходзіцца ў Астрашыцкім Гарадку, што каля Мінска. На час капрамонту бацька хлопчыка папрасіў выдзеліць іншае месца для рэабілітацыі дзяцей з інваліднасцю ў летні перыяд.

Як расказала першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея Лазарэвіч, якая прысутнічала на прыёме, рэабілітацыйны цэнтр «Расток» уключаны ў Інвестыцыйную праграму горада Мінска, яго рэканструкцыя ідзе па плане.

Наталля Качанава запэўніла заклапочанага бацьку, што возьме на асабісты кантроль вырашэнне дадзенага пытання, і паабяцала пабываць у рэабілітацыйным цэнтры ў хуткім часе. Неўзабаве, па яе словах, будзе вызначана і месца, дзе на перыяд капрамонту дзеці з інваліднасцю пройдуць рэабілітацыю. Акрамя таго, Старшыня Савета Рэспублікі пацікавілася ў заяўніка, ці патрэбная хлопцу медыцынская дапамога.

Сяргей Аляксандравіч расказаў, што сын, якому ўжо 17 гадоў, — інвалід з дзяцінства. Па словах заяўніка, уся неабходная медыцынская дапамога яму аказваецца, але, як кожны бацька, ён хацеў бы, каб яго дзіця развівалася, вучылася. «Хочацца, каб ён пайшоў працаваць, стварыў сям'ю і жыў самастойна», — прызнаўся мужчына. У сваю чаргу, Наталля Качанава заўважыла, што развіццю інтэграванага навучання ў Савеце Рэспублікі ўдзяляецца асаблівая ўвага. У канцы размовы яна запрасіла Сяргея Аляксандравіча на пасяджэнне рабочай групы па згаданай тэме. «Такія пытанні, якія агучваюць бацькі дзяцей-інвалідаў, мы будзем выносіць на абмеркаванне», — адзначыла яна.

### Некампетэнтнасць кадравай службы

— Чым мне вам дапамагчы? — звярнулася спікер верхняй палаты парламента да сужэнцаў Наталлі і Пятра Навакоўскіх, якія прыйшлі на асабісты прыём.

Жанчына расказала, што з ліпеня мінулага года хварэе. Калі пасля працяглага бальнічнага мінчанка выйшла на работу, з пэўных прычын ёй прапанавалі пайсці ў водпуск за свой кошт. Яна пагадзілася, але праз некалькі дзён зноў захварэла — прыйшлося нанава адкрываць бальнічны ліст. Аднак арганізацыя, у якой Наталля Міхайлаўна працуе, адмовілася жанчыне яго аплачваць — аргументуючы гэта тым, што супрацоўніца знаходзілася ў водпуску за свой кошт. Заяўніца звярнулася ў Савет Рэспублікі з просьбай, каб ёй аплацілі бальнічны ліст — для пенсіянеркі гэта немалыя грошы.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Дыялог з насельніцтвам, міжнародная павестка і занятасць беспрацоўных

## За вырашэннем якіх пытанняў правялі рабочы тыдзень сенатары

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Бярэзінскім раённым выканаўчым камітэце. Да парламентарыя звярнуліся па пытаннях падключэння дамоў да цэнтральнай сеткі водаправода, аказання паслуг ЖКГ, зямельных і грамадзянскіх спрэчак, аказання дапамогі на набыццё бытавой тэхнікі і іншага. Уважліва выслухаўшы заяўнікаў, Міхаіл Русы дэталёва разабраўся ў кожнай сітуацыі, даў неабходныя тлумачэнні грамадзянам, а мясцовым органам улады — адпаведныя даручэнні. Шэраг пытанняў узяты на асабісты кантроль сенатара. «З кожным прыёмам мы ўдасканальваем падыходы, і наша галоўная задача — зыходзячы з тых зваротаў, якія паступаюць да нас, сістэматызаваць пытанні, што найбольш часта ўздымаюцца, затым вызначыць прычыну іх з'яўлення і знайсці шляхі вырашэння, — адзначыў Міхаіл Русы. — Пры гэтым важна пачуць меркаванне насельніцтва і па больш глабальных пытаннях». Пасля правядзення прыёму грамадзян старшыня Пастаяннай камісіі азнаёміўся з ходам правядзення веснавых палявых работ у раёне.

● 28 красавіка — 2 мая старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад МПА СНД Сяргей Рачкоў узяў удзел у міжнародным маніторынгу за ходам падрыхтоўкі і правядзення рэферэндуму па праекце Канстытуцыйнага закона Рэспублікі Узбекістан «Аб Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан». У ходзе візіту ў Ташкент пад кіраўніцтвам сенатара быў праведзены шэраг сустрэч. У прыватнасці, група назіральнікаў МПА СНД за канстытуцыйным рэферэндумам ва Узбекістане на чале з Сяргеем Рачковым сустрэлася з кіраўніцтвам Канстытуцыйнага суда Узбекістана. У ходзе сустрэчы было адзначана, што Узбекістан упершыню ў гісторыі праводзіць рэферэндум па Канстытуцыі. Кажучы аб Асноўным Законе гэтай краіны, Сяргей Рачкоў заўважыў, што атрымаўся юрыдычна вывераны, глыбокі дакумент.

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец узяў удзел у пасяджэнні Мінскага раённага выканаўчага камітэта. Абмяркоўвалася пытанне рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» на тэрыторыі Мінскага раёна. Па выніках абмеркавання дадзенага пытання работа пастаянна дзеючай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Мінскага раёна была прызнана здавальняючай. Пры гэтым камісіі даручана прадоўжыць інфармацыйную работу ў рамках рэалізацыі Дэкрэта, аказанне кансультацыйнай, метадычнай і прававой дапамогі грамадзянам, якія звярнуліся ў камісію. Акрамя таго, дадзены шэраг даручэнняў КУП «ЖКГ Мінскага раёна», аддзелу жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінскага райвыканкама, інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінскім раёне.

**Вераніка КАНЮТА.**

СКАЗАЛІ — ЗРАБІЛІ

# РАБОТА СІСТЭМЫ ЖКГ ПАВІННА БЫЦЬ АБСАЛЮТНА ІНШАЙ

## Наталля КАЧАНАВА — пра водазабеспячэнне, добраўпарадкаванне і іншыя праблемныя пытанні сталіцы

**Кіраўнікі адміністрацый Мінска павінны займацца ўсімі пытаннямі: ад правапарушэнняў да эканомікі — для гэтага ў іх ёсць усе паўнамоцтвы. Неабходна выконваць усе паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця комплексна. І для гэтага павінны існаваць самая жорсткая дысцыпліна і парадак, перакананая Наталля Качанава, Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску. Аб гэтым было сказана на сустрэчы з актывам сталіцы пры абмеркаванні выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця за першы квартал.**

### «А як у мяне?»

Спікер адзначыла, што пэўныя праблемы існуюць у гандлі, будаўніцтве, сістэме ЖКГ, у рабоце са зваротамі грамадзян. Выканаты толькі адзін паказчык — па зніжэнні затрат, пра які казаў Прэзідэнт, астатняе — не. Яна нагадала пра неабходнасць уважліва слухаць выступленні Прэзідэнта на розных узроўнях, бо на іх ён дае дакладныя інструкцыі да дзеяння, якія трэба праламляць на сябе і задацца пытаннем «а як у мяне?»:

*— Прэзідэнт быў на мотавелазаводзе. Пакуль ён туды не прыехаў і не сказаў, ні ў каго і думкі не ўзнікла, што можна выкарыстоўваць гэтую пляцоўку як арэндную. А цяпер са 150 тысяч м² плошчы там 120 ужо закантрактаваныя, і прадпрыемствы ды вытворчасці чакаюць, калі засяляцца туды і пачнуць працаваць. Пры гэтым працуе і сам завод без спынення.*

Трэба думаць, дзе і як замяшчаць даходы, якія прыносілі сферы, што з-за аб'ектыўных прычын сёння «праселі», звярнула ўвагу Наталля Качанава.

*— У нас павінна быць прадукцыя, якую можна рэалізоўваць, не запаўняючы склады. Напрыклад, прадукцыя прадпрыемства «Камволь» сёння практычна ў кожнай краме. Наша задача цяпер — выпускаць большы асартымент тканін і напаўняць імі крамы. Было заданне 6 мільёнаў пагонных метраў тканіны выпускаць — значыць трэба выпускаць, і сёння ёсць куды яе прадаць. І цана добрая — метр тканіны — 12-13, самая дарагая — 16 рублёў, гэта прымальны кошт.*

### Капрамонт, адсяленне, могілкі

Наталля Качанава перакананая, што работа сістэмы ЖКГ павінна быць абсалютна іншай, бо бадай што палова зваротаў грамадзян датычыцца менавіта дадзенай сферы. Яна згадала сітуацыю, з якой да яе на прыём па асабістых пытаннях прыйшла мінчанка:

*— Жанчына задаецца пытаннем, чаму сёння плата за прыборку і асвятленне месцаў агульнага карыстання ў доме бярэцца ў залежнасці ад плошчы кватэр, а не ад колькасці жыльцоў. І я цалкам згодная, што гэта няправільна. І кіраўнік адміністрацыі мог бы ўзняць гэтае пытанне, каб яго вырашалі на самым высокім узроўні. У людзей невырашэнне пытанняў па іх зваротах, калі іх накіроўваюць ад адной інстанцыі да іншай, што выклікае незадавальненне. А гэта як лакмусавая паперка фарміравання даверу да ўладаў.*

Капітальны рамонт павінен быць выкананы якасна, а не так, каб людзі гадамі хадзілі і дабіваліся выпраўлення яго хібаў. Вясенні абход зрабілі — расказалі ў прэсе, дзе што будзе сёлета зроблена, каб людзі ведалі. Адносна адсялення таксама трэба дакладна вызначацца: сектар адсяляюць — значыць адсяляюць. Навошта пераносіць тэрміны, калі людзі не ведаюць, абнаўляць ім сваё жыллё ці чакаць адсялення. Або здараецца, што ўвогуле перадумалі адсяляць, ці наадварот — тэрмінова трэба выязджаць заўтра.

*— Гэта ўжо работа службаў архітэктуры — дакладна вызначыць, дзе што будзе рабіцца. Ёсць генплан, растлумачце людзям, дзе раён індывідуальнай забудовы застаецца, а дзе — не, — заклікала Наталля Качанава, звяртаючыся да кіраўніцтва сталіцы. — Сёння вы можаце прапанаваць свае варыянты, як будзе працаваць гэтая сістэма, дакладна выбудаваная, у сталіцы. Унесены змяненні ў дырэктыву ЖКГ, але ж гэта не застылы дакумент. Усё павінна быць гібкім і дакладным, але са зменай умоў павінны мяняцца і вы, каб знаходзіць метады, як працаваць з людзьмі. Павінны перавесці на падземныя крыніцы Мінск да 2025 года? Трэба тлумачыць людзям, што мы працуем у графіку і будзе, як і запланавана.*

Трэба звярнуць увагу і на арганізацыю работы па аказанні рытуальных паслуг і адносна могілак, засяродзіла ўвагу сенатар. Яна прывяла прыклад жанчыны, якой ужо за 80, і яна ўсё жыццё ходзіць на пагост да мужа і сына, які памёр маленькі. А цяпер ёй кажуць, што на месцы побач з роднымі, якое яна для сябе падрыхтавала, ёсць нейкае пахаванне. Разабраліся — няма там пахавання. Але ж з'явіліся яшчэ нейкія праблемы: напэўна, нехта вельмі зацікаўлены ў гэтым кавалачку зямлі. Падобныя пытанні неабходна кантраляваць.

### Для каго і дзе будаваць, што прадаваць

Грошы павінны расходавацца эфектыўна, і так, каб быў вынік. Шмат пытанняў узнікае адносна даўгабудаў і кошту жылля. Тры тысячы за квадратны метр для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў — хіба гэта магчыма? — задалася пытаннем спікер і выказала меркаванне, што можна было б будаваць больш панэльных, а не каркасна-маналітных дамоў для людзей такой катэгорыі. У сталіцы, дарэчы, каля 180 тысяч чалавек, якія стаяць на чарзе.

*— Панэльныя будынкі будуць каштаваць танней, і чарга асоб, якія маюць патрэбу ў жыллі, будзе рухацца хутчэй. Давайце больш будавацца ў гарадах-спадарожніках, у тых жа Смалявічах, Рудзенск развіваць, іншыя рэгіёны, каб людзі не жылі па 20 гадоў у інтэрнатах.*

Што датычыцца гандлю, то тут усё неадназначна, ахарактарызавала сітуацыю Наталля Качанава:

*— Усе крамы, нават тыя, што ў крокавай даступнасці, павінны выглядаць прыстойна, мець добры асартымент, раскладку і ўмераныя цэны. А айчынная прадукцыя ў іх — змяшчацца на цэнтральных паліцах, як і тавары з нацыянальнай сімволікай. Тое ж самае датычыцца і запраўак.*

**Ірына СІДАРОК.**

# ПАЧУЦЬ КОЖНАГА І ДАПАМАГЧЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Мы зоймемся прыведзеным пытаннем, — паабяцала Наталля Качанава. — Я бачу тут некампетэнтнасць кадравай службы інстытута (заяўніца працуе ва ўстанове Міністэрства прамысловасці. — **«Зв»**.).

Наталля Іванаўна пацікавілася, што канкрэтна ў жанчыны са здароўем і ці прымае яна лекі. Акрамя таго, спікер удакладніла, ці даўно грамадзянка была ў санаторыі, у сувязі з чым дала даручэнне выдзеліць пажылым мінчанам пуцёўку.

Падзякаваўшы за такую ўвагу, сужэнцы Навакоўскія ўзнялі яшчэ адно пытанне. Іх дачка загінула ў масавай цісканіне ў падземным пераходзе каля станцыі метро «Няміга» — трагедыя адбылася 30 мая 1999 года. Заяўнікі запыталіся, ці магчыма ім, а таксама іншым бацькам, у якіх тады загінулі дзеці, разлічваць на пэўны статус. Абнадзейваць жыхароў сталіцы Старшыня Савета Рэспублікі не стала, але паабяцала ўзняць гэтае пытанне на ўзроўні горада.

— Наталля Іванаўна з такім разуменнем нас выслухала, чалавек так прасякнуўся праблемай і адразу ўхапіўся за «нітачку», за якую ўсё гэта трэба разблытваць, — падзялілася сваімі ўражаннямі ад прыёму Наталля Навакоўская. — Нам ёсць з чым параўноўваць: дагэтуль мы ўжо куды толькі ні звярталіся. Задаволеныя сустрэчай, думаю, вынік будзе.

### Высяляюць з жылля. А куды?

Людміла Міхайлаўна і Дзінара Раманаўна прыехалі ў Савет Рэспублікі з Дзяржынска. Жанчыны пражываюць у шматкватэрным доме, пабудаваным 36 гадоў таму ад мясцовага райспажыўтаварыства. У 2006 годзе Белкаапсаюзам была прынята пастанова аб перадачы кватэр у карыстанне жыхарам. Паколькі ў арганізацыі жанчыны завяршылі сваю работу, іх хочуць высяліць з кватэр. Адна з заяўніц расказала, што нядаўна ў яе нарадзілася ўнучка, якую яны нават прапісаць у гэтай кватэры ўжо не могуць. Гаспадыням жылплошчы прапаноўваюць выкупіць жыллё. Заяўніцы адзначылі, што для іх гэта непад'ёмная сума.

Спікер верхняй палаты парламента спытала ў першага намесніка старшыні праўлення Белкаапсаюза, які прысутнічаў падчас прыёму, як такое рашэнне было прынята. «Куды людзей дзенеце?» — удакладніла яна. Аляксандр Скрундзеўскі адзначыў, што выганяць людзей на вуліцу нават думкі не было.

— Па-першае, паглядзіце, адкуль такія цэны, — звярнулася Наталля Качанава да прадстаўніка Белкаапсаюза. — Новае жыллё будуецца па больш прымальных цэнах. Выдзялялі гэтае жыллё незразумела як. Тым не менш столькі гадоў людзі пражылі... Патрэбна зрабіць дакументы, каб людзі жылі. А калі выкупіць кватэры ва ўласнасць, то не па такой цане.

У Белкаапсаюзе паабяцалі вырашыць пытанне. У сваю чаргу, Савет Рэспублікі трымае сітуацыю на кантролі.

### Несправядлівасць у аплаце

Без пытанняў, датычных жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у Савеце Рэспублікі не абыходзіцца ні адзін прыём грамадзян. Гэты раз не стаў выключэннем. Мінчанка Тацяна Іванаўна паскардзілася на нерацыянальнасць аплаты такой паслугі ЖКГ, як асвятленне і прыборка месцаў агульнага карыстання. Жанчына лічыць, што несправядліва разлічваць аплату ад метражу кватэры. Па яе словах, сума аплаты павінна залежаць ад колькасці тых, хто пражывае ў кватэры.

— Я адна жыву, а мае суседзі — учатырох, — канкрэтызавала заяўніца. — Але паколькі мая кватэра большая, за асвятленне і прыборку ў пад'ездзе я плачу больш, чым яны. Хоць лагічна, што смецця больш наносяць чатыры чалавекі, чым адзін.

Наталля Качанава пагадзілася з прэтэнзіяй мінчанкі да жыллёва-камунальнай службы. Па яе словах, налічваць аплату за ацяпленне, зыходзячы з метража кватэры, — правільна, але суадносіць з метражом прыборку месцаў агульнага карыстання — нонсэнс. Спікер верхняй палаты парламента дала шэраг даручэнняў Міністэрству жыллёва-камунальнай гаспадаркі і паведаміла, што парламентарыі яшчэ раз вернуцца да Жыллёвага кодэкса, каб перагледзець прыведзенае пытанне.

### Статусу вязня быць ці не быць?

Мінчанка Валянціна Міхайлаўна прадстаўляла інтарэсы сваёй маці. Той 92 гады, яна жыве ў Пружанах, таму самастойна і з прычыны ўзросту, і з-за немалой адлегласці прыехаць у Савет Рэспублікі не змагла. Алена Міхайлаўна, маці заяўніцы, у гады Вялікай Айчыннай вайны жыла на тэрыторыі акупаванай Беларусі. У ліпені 1942 года яна была вывезена на прымусовыя работы ў Беласток. З 1994 года жанчына мела статус малалетняга вязня. Праз тры гады статус у адносінах да жанчыны быў адменены.

— Растлумачылі гэта тым, што ў перыяд, калі мама знаходзілася на прымусовых работах, Беласток з'яўляўся тэрыторыяй БССР, — звярнула ўвагу Валянціна Міхайлаўна.

Наталля Качанава пацікавілася, ці ёсць у жанчыны дакумент, які пацвярджае тое, што яе мама знаходзілася на прымусовых работах у Беластоку. Заяўніца паказала даведку, выдадзеную ёй Дзяржаўным архівам Брэсцкай вобласці. Мінчанка паказала і пасведчанне да юбілейнага медаля, уручанага яе маці да 50-годдзя Перамогі.

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што такіх людзей, як маці заяўніцы, вывозілі сілком. Чаму іх не лічаць вязнямі, давядзецца разабрацца. Адпаведныя даручэнні былі дадзены кампетэнтным службам.

### Чыя агароджа?

Жыхарку Валожынскага раёна Маргарыту Пятрову ў Савет Рэспублікі прывяло зямельнае пытанне, а дакладней — высокая агароджа, устаноўленая суседзямі на ўездзе да гаспадарчых пабудоў уладальніцы. Цяпер, каб трапіць да свайго ўчастка на машыне, сям'і заяўніцы трэба аб'ехаць усю вёску.

Спікер верхняй палаты парламента ў курсе пытання — некалькі тыдняў таму сітуацыя абмяркоўвалася падчас прамой тэлефоннай лініі. Наталля Качанава здзіўленая, што дагэтуль мясцовыя ўлады не вырашылі праблему.

Як расказаў першы намеснік старшыні Валожынскага райвыканкама Віктар Лявонік, прадстаўнікі мясцовай улады выязджалі ў вёску па згаданым пытанні. На іх думку, агароджа на месцы праезду ўстаноўлена законна.

Тое, што разабрацца ў сітуацыі на мясцовым узроўні не атрымаецца, стала зразумела тады, калі абодва бакі пачалі паказваць фотаздымкі і даказваць свой пункт гледжання. Тым больш што, са слоў заяўніцы, у яе адрас паступалі пагрозы: у прыватнасці, павышанай увагі органаў сацыяльнай абароны да шматдзетнай сям'і. У сувязі з гэтым першае даручэнне Наталлі Іванаўны — разабрацца ў пытанні органам унутраных спраў. Акрамя таго, высвятленнем зямельнай спрэчкі будзе займацца профільная камісія Савета Рэспублікі. Аднак тое не вызваляе мясцовыя органы ўлады ад адказнасці. «Зрабіце так, каб было зручна і аднаму чалавеку, і другому», — звярнула ўвагу першага намесніка старшыні райвыканкама спікер.

Маргарыта Пятрова засталася задаволеная тым, што было зроблена для вырашэння пытання, з якім яна звярнулася ў Савет Рэспублікі. «Вельмі добра, што існуюць такія прыёмы», — заўважыла яна.

Падчас прыёму грамадзян узнімаліся самыя розныя пытанні. Адказ атрымаў кожны. Камусьці пашчасціла — іх сітуацыю вырашылі непасрэдна на месцы. Для высвятлення іншых пытанняў спатрэбіцца пэўны час. Даручэнні кампетэнтным органам дадзены. Застаецца чакаць іх выканання.

**Вераніка КАНЮТА.**

# АД ІНІЦЫЯТЫВЫ ДА ВЫНІКУ

## У Магілёўскай вобласці прайшоў першы рэгіянальны форум, прысвечаны мясцоваму самакіраванню

**Дэвіз I рэгіянальнага форуму «Мясцовае самакіраванне ў Магілёўскай вобласці» — «Ініцыятыва, адзінства, дзеянне, вынік» — вызначыў і сам сэнс падзеі. Мерапрыемства абагульніла назапашаны вопыт, выявіла дамінанты, расставіла акцэнты. А галоўнае, наглядна паказала, што работа толькі тады мае плён, калі ў ёй задзейнічаны ўсе, пачынаючы ад жыхароў, заканчваючы дэпутатамі і прадстаўнікамі выканаўчай улады.**



Форум аб'яднаў некалькі пакаленняў.

### Ініцыятыўнасць трэба выхоўваць

Форум ахапіў усю вобласць. На працягу трох дзён у Магілёве, Бабруйску і райцэнтрах паўсюдна праходзілі выставы, круглыя сталы, актуальныя дыялогі, акцыі па пасадцы Алей міру і стваральнай працы. У рабоце былі задзейнічаны ўсе — моладзь, прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання, народныя выбраннікі, спецыялісты абл-, гар-, райвыканкамаў, парламентарыі, заканатворцы.

Тэма мясцовага, вучнёўскага і студэнцкага самакіравання і сучасныя падыходы ў іх развіцці раскрывалася падчас работы адпаведных секцый, якія працавалі на пляцоўках магілёўскіх ВНУ і Бабруйскага гарсавета. Адзін дзень форуму быў прысвечаны Адзінаму дню самакіравання. Актывісты маладзёжных парламентаў правялі яго разам са старшынямі рай- і гарсаветаў, паглядзелі, як тыя працуюць. Вынікі трохдзённай работы былі падведзены на пленарным пасяджэнні, якое адбылося на базе Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (БРУ). Падчас яго былі ўзнагароджаны пераможцы віктарыны сярод школьнікаў і студэнтаў на веданне гісторыі развіцця мясцовага самакіравання, выбарчага працэсу і актуальных аспектаў нарматворчасці. Ініцыятыва не правядзення належала Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. На пленарным пасяджэнні была таксама падпісана Дэкларацыя аб далучэнні да дасягнення Мэт устойлівага развіцця паміж Магілёўскім аблвыканкамам і БРУ.

На базе ВНУ ў гэты ж дзень адбылася прэзентацыя Міжнароднага навукова-даследчага цэнтра па ўстойлівым развіцці, зялёнай эканоміцы і інфарматызацыі.

— Моладзь — вялікая рухаючая сіла грамадства, мы гэтую місію разумеем і выкарыстоўваем,— падкрэсліў падчас адкрыцця цэнтра **рэктар БРУ Міхаіл ЛУСЦЯНКОЎ.** — У беларускіх ВНУ створаны магчымасці для самарэалізацыі і рэалізацыі студэнцкіх ініцыятыў. Адкрыццё на базе нашага эканамічнага факультэта навукова-адукацыйнага цэнтра для прасоўвання ідэй устойлівага развіцця, зялёнай эканомікі і інфарматызацыі — яшчэ адзін крок для самарэалізацыі моладзі. Кожную восень мы праводзім для ініцыятыўных дзяўчат і хлопцаў конкурс стартапаў, у якім бяруць удзел нават школьнікі. Да нас паступаюць праекты з усёй вобласці, мы іх разглядаем, але шматлікія ідэі маюць патрэбу ў дапрацоўцы. Цяпер будзе магчымасць яшчэ іх і пралічыць.

### 10 тысяч аб'яднаных ідэямі самакіравання

Менавіта такая агульная колькасць насельніцтва задзейнічана па вобласці ў органах мясцовага самакіравання. Пра гэта паведаміла **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.**

— Важнасць нашага вялікага мерапрыемства цяжка пераацаніць, — адзначыла яна. — На працягу трох дзён разам з дэпутатамі працавалі прадстаўнікі Маладзёжнага парламента, студэнцтва, школьнікі. Наша задача была аб'яднаць вакол пытанняў мясцовага самакіравання не толькі дэпутатаў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, але і грамадскасць. І вельмі важна, што на ўзроўні аблвыканкама і аблсавета ініцыятывы ад жыхароў знаходзяць падтрымку, у тым ліку фінансавую.



На выставе можна было ўбачыць справаздачы добрых спраў, якія рэалізавала насельніцтва разам з уладай.

Пра важнасць форума казаў і **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР.**

— Сумесная работа выканаўчых органаў з дэпутатамі праводзіцца пастаянна, — канстатаваў ён. — Без разумення праблем, якія сёння цікавяць жыхароў нашай вобласці, без ранжыравання гэтых праблем немагчыма пабудаваць ніякую стратэгію. Нам вельмі важна ведаць, якія праблемы хвалююць грамадзян, якія праблемы яны лічаць найбольш важнымі, і канцэнтраваць увагу на вырашэнні гэтых пытанняў. Работа такая вялася заўсёды, але цяпер мы імплеменціравалі стратэгію ўстойлівага развіцця ва ўсе праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку, у тым ліку раённыя. І ў гэтым супрацоўніцтве мы бачым залог развіцця ўсёй вобласці.

### Ініцыятывам — зялёнае святло

Сёння ў беларускім парламенце вядзецца вялікая работа па пытаннях змянення, дапаўнення, прыняцця новых законаў, якія рэгламентуюць дэпутацкую дзейнасць. Рыхтуецца праект Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, у які будуць уносіцца змяненні і дапаўненні. Напрыклад, з'явіцца новая глава па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятываў.

— Моцная рэгіянальная палітыка, развітое мясцовае самакіраванне — гэта ініцыятывы, самазанятасць, усё тое, пра што ішла гаворка падчас форуму, — рэзюмаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК.** — Калі мы гаворым пра заканадаўчую практыку, мэты ўстойлівага развіцця, то галоўнае ў гэтым — якраз нацыянальны інтарэс, інтарэс краіны, рэгіёнаў. Мы займаемся ініцыятывамі і праектамі, каб дастойна прадстаўляць краіну ў свеце. Напружаная работа ідзе па прывядзенні ў парадак законаў з улікам канстытуцыйных змяненняў, якія адбыліся. Што датычыцца мясцовага самакіравання, самае галоўнае, каб людзі, выкарыстоўваючы той заканадаўчы інструментарый, які ёсць на сённяшні дзень, маглі рэалізаваць свае ініцыятывы. Мы павінны рэагаваць не на нейкія сістэматычныя скаргі прафесійных скаржнікаў, а на тыя ініцыятывы, што ідуць ад людзей, якія і самі гатовыя ўкласціся, і іншых падцягнуць. Грамадзянская супольнасць — гэта самаініцыятыўныя грамадзяне, якія ўзаемадзейнічаюць у рамках Канстытуцыі і ў рамках заканадаўчага поля з органамі ўлады. Магілёўская вобласць дэманструе вялікую актыўнасць і тут ажыццяўляецца шмат ініцыятыў. Гэта выдатна паказвае, што рэгіён развіваецца і імкнецца быць у лідарах.



Школьніца з Краснаполля Валерыя НЕДАПЫТАЛЬСКАЯ атрымала дыплом за перамогу ў віктарыне на веданне мясцовага самакіравання.

### Арыентацыя на моладзь

Фарміраванне ў свядомасці школьнікаў асноў беларускай дэмакратыі ў першую чаргу залежыць ад педагагічных работнікаў. На гэтым акцэнтаваў увагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алег ДЗЯЧЭНКА.**

— Для таго каб фарміраваць дэмакратыю, павінны быць адпаведныя ўмовы, — лічыць ён. — Правядзенне форуму якраз і ёсць адна з умоў фарміравання дэмакратыі ў нашай дзяржаве, фарміравання народаўладдзя. На форуме мы абмяняліся вопытам работы органаў мясцовага самакіравання, паглядзелі, як яны фарміруюцца са школы. У рабоце секцыі «Вучнёўскае самакіраванне — шлях да развіцця асобы» ўзяло ўдзел фактычна каля 500 педагагічных работнікаў — сто непасрэдна, астатнія далучыліся ў фармаце відэаканферэнцыі. Усяго да абмеркавання надзённых пытанняў падключыліся 272 школы Магілёўскай вобласці. Фактычна мы правялі ўнікальную па сваім маштабе і змесце дыялогавую пляцоўку па абмене перадавым педагагічным вопытам палітычнай сацыялізацыі асобы, выяўлення сярод школьнікаў будучых лідараў грамадскай думкі, фарміравання лідарскіх якасцяў навучэнцаў.

З гэтым меркаваннем цалкам згодны **старшыня Маладзёжнага парламента пры аблсавеце Міхаіл ПАГОЦКІ.**

— Школы — стартавая пляцоўка, дзе закладваюцца асновы маладзёжнага парламентарызму, — канстатаваў ён. — Моладзь атрымлівае той вопыт, які ёй спатрэбіцца ў будучым. У кожнай ВНУ развітое студэнцкае самакіраванне, кірунак аднолькавы — прасоўваць ідэі, рэалізоўваць сябе ў спорце, праектнай дзейнасці, навуцы і гэтак далей.

### Акцэнт — выключна на канструктыўныя ініцыятывы

З 2015 года на Магілёўшчыне актыўна працуе з ініцыятывамі насельніцтва абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, якая падтрымлівае насельніцтва. **Старшыня праўлення Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН** падзяліўся думкамі наконт таго, што можа аб'яднаць людзей.

— Трэба шукаць тыя прапановы і ідэі, якія і на наш погляд, і на погляд людзей, што жывуць у тым ці іншым мікрараёне, важныя, — лічыць ён. — Для гэтага трэба ведаць сваіх выбаршчыкаў у твар, быць у курсе іх надзей і патрэб. Тады будзе проста вырашаць праблему, нават калі існуюць фінансавыя складанасці. І трэба ўсё даводзіць да ведама насельніцтва. Тая ж віктарына, якую мы правялі, таксама карысны вопыт. Калі школьнікі будуць разумець азы мясцовага самакіравання, яны змогуць праявіць сябе і ў студэнцкай сферы, і ў жыцці.

